Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛІСТАПАД 13 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 250 (4794)

Год выдання XV

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: Перадавы—Першая палітаддзельская зіма на транспарце не павінна ведаць перабояў у рабоце.

Пастанова прэзідыума ЦВК СССР АБ УЗНАГАРОДЗЕ АРГАНІЗАТАРАЎ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЛЕТА Ў СТРАТАСФЕРУ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КАРАКУМСКАГА АЎТАМАБІЛЬНАГА ПРАБЕГА.

У Гомелі пушчан буйнейшы ў Саюзе шклагігант.

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ ТАВ. ГІКАЛО.

М. ВІШНЕЎСКІ—ім шаснаццаць год.

Прабыванне М. М. ЛІТВІНАВА ў ПАЗШ.

Зварот совецкай дэлегацыі з Турэцкай рэспублікі.

У гасцях у ленінградскіх пролетарыяў.

ПЕРШАЯ ПАЛІТАДДЗЕЛЬСКАЯ ЗІМА НА ТРАНСПАРЦЕ НЕ ПАВІННА ВЕДАЦЬ ПЕРАБОЯЎ У РАБОЦЕ

На фоне ўсеагульнага заняпада і застоя транспарта ў капіталістычных краінах асабліва рэзкіфна выступаюць дасягненні чыгуначнага транспарта СССР. Чыгуначны транспарт Совецкага саюза ўступіў у 16-ю гадавіну Кастрычніка са значна ўмацаванай матэрыяльна-тэхнічнай базай.

Даволі сказаць, што грузавая работа чыгуначнага транспарта СССР перавышае даваенны ўзровень больш чым у 2 з паловай разы. Даўжыня чыгуначнай сеткі перавышае даваенную на 43 проц., а азіяцкай часткі сеткі больш чым на 70 проц.

Няўхільна праходзіць тэхнічнае пераўзбраенне чыгуначнага транспарта. Павышаецца магутнасць перавозачных сродкаў. Так, сярэдняя магутнасць таварнага паравоза ў канцы 1932 г. перавышала магутнасць даваенных паравозаў на 37 проц., а паравозаў серыі «Э» — на 75 проц. Наша тэхніка ідзе і далей. Нядаўна сканструяваны і ўжо пабудаваны першы таварны паравоз серыі «ФД» і пасажырскія «ІС» па сваёй магутнасці перавышаюць цяперашнюю лінію паравозаў «Э» на 30 проц. Рэгструць лініі, абслугоўваемыя электрычнай цягай (350 клм.), павялічваецца колькасць магутных цеплаозаў, вялікапрузных вагонаў (амаль 100 тыс. новых), цыстэрнаў і г. д. Усе гэтыя факты паказваюць, як шырока ахапіла тэхнічная рэвалюцыя чыгуначны транспарт нашай краіны.

Уступіўшы ў строй магутны завод вагонных і паравозных запасных частак — Можэйскі, заканчваемыя пабудовай заводы, выраблялучыя абсталяванне для аўтабліскіруючых, новы луганскі гігант паравозабудаўніцтва (гадавая прадукцыя яго па цяперашнім сіле будзе перавышаць у два разы ўвесь выпуск таварных паравозаў з усіх заводаў у 1932 г.), электравозны цэх на заводзе «Дынамо», суседні гігант вагонабудаўніцтва — тагільскі камбінат і інш. — усё гэта стварае тую моцную індустрыяльную базу, якая забяспечвае паспяховае завяршэнне карэннай рэканструкцыі чыгуначнага транспарта.

Наша партыя і ўрад сканцэнтравалі выключную ўвагу на пытаннях чыгуначнага транспарта. Тыя велізарныя поспехі, якія мы маем, ні ў якой меры не могуць замазаць узнікшых у апошні час адзнакаў аслаблення работы. Прычыны гэтага аслаблення з большэвіцкай выразнасцю ўказаны ў гістарычных пастановах ЦК і СНК.

Чыгуначны транспарт уступае ўжо ў самы цяжкі і адказны перыяд асенне-зімовых перавозак. Зімой, у марозы і снегавыя заносы, значна цяжэй трымаць у парадку шлях, рамантаваць паравозны і вагонны парк, вытрымліваць патрэбную хуткасць цягнікоў і г. д. Вось чаму баявая падрыхтоўка да зімовых умоў работы мае выключна важнае значэнне.

На радзе вузлоў, станцый, дыстанцый і дэпо БССР па ініцыятыве палітаддзелаў праведзена масавая праверка падрыхтоўкі да зімы. Праверкай выяўлен рад агідных фактаў «сановитирательства», самазадавальнення асобных кіраўнікоў і зусім нездавальняючае сапраўднае становішча.

Як вядома, галоўнае ў падрыхтоўцы да зімы — паравозны і вагонны паркі, шлях, гатоўнасць да снегабарацьбы і вадаснабжэнне. Між тым становішча ўсяго гэтага па чыгуначных раёнах БССР далёка нездавальняючае. Скрозь і ўсюды (Віцебск, Полацак, Менск і інш.) дэпо не агледжаны, не адремонтаваны, дахі цякуць, вакзальныя шыбы павыбіты, [illegible] не прыведзены ў парадак. Ці [illegible] на падставе гэтага гаварыць, што дэпо паспяховаюць паспяховы зімовы рамонт паравозаў і вагонаў? Безумоўна, не. Трэба неадкладна і ў першую чаргу заняцца гэтай работай.

Аздаравуленчая кампанія прайшла, але якасць рамонта паравозаў і вагонаў вельмі нізкая. Бываюць выпадкі, што ў адрамантаваных паравозах і вагонах выяўляюцца дзесяткі новых дэфектаў, і паравозы, якія выйшлі з рамонта, з суседняй станцыі вяртаюцца назад у дэпо. Усё яшчэ зацягваецца вялікая даў перабояў у рабоце.

Колькасць зрываў спаранай і здарэнняў.

Прыведзеныя факты ёсць проста разультат слабай працоўнай дысцыпліны. Трэба проста сказаць, што на мясцах яшчэ няма большэвіцкай барацьбы за рэалізацыю зусім ясных дырэктыў аб умацаванні жалезнай, свядомай дысцыпліны. Пара зразумець, што «дабіцца найстрэжэйшай, па сутнасці, ваеннай дысцыпліны спрод чыгуначнікаў — першае і асноўнае, святая святых. Без гэтага не ўдасца правесці ў жыццё ні аднаго з мерапрыемстваў партыі, без гэтага не зламаць і сабатажа, бо на справе часта цямна адрозніць просты сабатаж ад недысцыплінаванасці». («Праўда»).

Зусім нездавальняючае становішча з падрыхтоўкай да зімы і шляхавай гаспадаркі. Так, напрыклад, па 34 дыстанцыі шляха (ВІЦЕБСКІ раён) план рамонта выкананы усяго капя 60 проц. Не лепш і ў радзе іншых. Дрэнная якасць рамонта, перакосы, прасадкі, выплёскі шляха — масавае з'явішча. Заслугоўвае пашырэння вопыт 8-й дыстанцыі (МЕНСК), дзе шляхавікі, рабочыя-рамонтнікі ўзялі шэфства над асобнымі кіламетрамі шляха і стрэлкамі («Звязда» нумар 231)). Трэба скарыстаць гэты вопыт на ўсіх шляхах для практычнага шэфства і ўтрымання іх ва ўзорным стане.

Падрыхтоўка да снегабарацьбы мае выключна актуальнае значэнне. Не тады, калі пачнецца снегавая завея, а за раз, не адкладаючы ні адной гадзіны, трэба падрыхтаваць усё для ачыстні шляхоў. Між тым, рад дыстанцый шляха па-старому думаюць, што яшчэ рана гэтым заняцца. 29 дыстанцыя (ЖЛОБІНСКІ раён) адрамантавала шчыты ўсяго на 46 проц., снегаачышчальнікі яшчэ зусім не рамонтавала, дагаварой з калгасамі на рабочую сілу не заключыла. Такое-ж прыкладна становішча і па 30 і 33 дыстанцыі (ЖЛОБІН), 10 (ВІЦЕБСК) і інш.

У справе барацьбы са снегавымі заносамі на дапамогу транспарту павінны прыйсці палітаддзелы МТС. Тут трэба скарыстаць ініцыятыву рада украінскіх палітаддзелаў МТС, якія ажыц цяўляюць практычную дапамогу транспарту шляхам выпучэння рабочай сілы і прымацавання асобных калгасаў да пэўных участкаў, раз'ездаў і станцый.

Вадаснабжэнне — важнейшы ўчастак падрыхтоўкі транспарта да зімы. Аднак, на гэтым участку не ўсё добра. У «Звязадзе» гэтымі днямі ўжо змяшчаліся матэрыялы, якія сведчаць, што ў ВІЦЕБСКІМ і АРШАНСКІМ раёнах да апошніх дзён сабатавалася работа па падрыхтоўцы сістэмы вадаснабжэння да зімы. Такое-ж становішча і ў ЖЛОБІНСКІМ раёне. Водакачкі, водаразборныя і гідраўлічныя калонкі ў запушчаным стане. Да ацяплення іх не прыступалі.

Рашуча перамагаючы супраціўленне класава-варожых элементаў і сабатажнікаў, ачышчаючы ад іх транспарт, яшчэ і яшчэ раз праверым падрыхтоўку да зімы ўсіх участкаў транспарта. Канчаткова выгажым з транспарта канцылярска-бюракратычныя метады работы. Праверка выканання — у гэтым большэвіцкі стыль работы. Высока ўзнімуць шы працдысцыпліну, даб'ёмся поўнага асваення грузапатока.

«Праўда» ў перадавым артыкуле, прысвечаным 16 гадавіне, вызначаючы задачы на 17 год социялістычнага будаўніцтва, пісала: «Асаблівую ўвагу мы сканцэнтруем на ўзнаўленні транспарта. Сюды максімум сіл і сродкаў! Падняць сёння транспарт — значыць стварыць прадпасылкі для поўнага вынкарыстання той выключна спрыяючай гаспадарчай абстаноўкі, якую мы маем. Усе сілы на выкананне народна-гаспадарчага плана! Транспарт і яшчэ раз транспарт — вось якую задачу павінны вырашыць большэвікі. І яны вырашаць яе пераможна, бо няма такіх крэпасцей, якіх не ўзялі-б большэвікі»! Гэта ўказанне павінны ўлічыць усе арганізацыі транспарта і тэрытарыяльныя арганізацыі.

Палітаддзельцы, комуністы і перадавыя рабочыя-чыгуначнікі! Дабейцеся поспеха ва ўзнаўленні транспарта, дабейцеся, каб у гэту зіму транспарт не ведаў перабояў у рабоце.

ПАЧАУСЯ КОМСАМОЛЬСКІ СУБОТНІК

У адзнаку XV-гадавіны ленінскага комсамола ЦК УсеЛКСМ вынес пастанову аб правядзенні ўсесаюзнага суботніка моладзі на ўсіх прадпрыемствах, калгасах, саўгасах, навучальных установах. Сродкі ад суботніка паступяць у жалезны фонд абароны СССР.

Учора адбыўся першы дзень субот ніка. У гэты дзень выйшла на субботнік пераважная большасць навучальных устаноў, выйшлі на суботнік і прадпрыемствы, у якіх быў выходны дзень.

У Менску на суботніку працавала 6.172 чал. На будаўніцтве ЦЭЦ 300 чалавек, у Ваенвадзе—1.080 чалавек, на чыгунцы—220 чал., на будаўніцтве тэатра—200 чал., на будаўніцтве дома друку—100 чал. і г. д.

Рабфак БДУ даў 370 чал., політэхнічны інстытут—1.350 чал. Добрую і ўмелую арганізаванасць паказаў аўтадарожны рабфак. Рабфакаўцы прышлі на суботнік з падрыхтаванымі брыгадамі і брыгадзірамі, а на чале ўсёй калоны стаяў трыкутнік.

Разам з гэтым у першы дзень выяўлены і цалы рад недахопаў. Непадрыхтаванасць атрымалася на многіх прадпрыемствах.

На Вадаканалтрэст было пакіравана 600 чалавек. А дырэктар трэста «пастараўся» нават не з'явіцца. У выніку 600 чалавек мелі нямалы пра

У іншых мясцах гаспадарнікі ігнаруюць суботнік, спіць з комсамольцаў. Да такой катэгорыі трэба аднесці менскае Загатзбожка. 11-га лістапада кіраўнікі яго ў гаркоме комсамола прасілі 190 чалавек. Менскі гарком КСМ паслаў толькі 140 чал. А работу 12 лістапада знайшлі толькі для 40 чалавек. 100 удзельнікаў суботніка пайшлі назад.

Учора павінна была выйсці на суботнік і Дзяржбібліятэка. Але ў выніку адсутнасці масавай і паогул падрыхтоўчай работы, у выніку недаацэнкі суботніка з боку комуністаў Дзяржбібліятэкі на суботнік прышоў адзін толькі комсамольскі сакратар.

Як пачалі суботнік у раёнах яшчэ няма поўных вестак. Паасобныя райкомы КСМ паведамляюць у ЦК ЛКСМБ, што партыйныя арганізацыі не аказваюць належнай дапамогі ў правядзенні суботніка. Дзяржынскі РК КП(б)Б, напрыклад, нават да 12 лістапада не палічыў неабходным абгаварыць гэта пытанне.

Усе райкомы КП(б)Б, усе партыйныя калектывы і ячэйкі абавязаны арганізаваць неадкладную дапамогу комсамолу ў правядзенні суботніка. Да 24 лістапада сабраныя сродкі ад суботнікаў неабходна перавесці на рахунак № 92-89, рапартаваць ЦК партыі і ЦК комсамола аб паспяховым правядзенні суботнікаў, аб новым і масавым паказчыку сродкамі жалезнага фонда абароны краіны.

М.

АБ УЗНАГАРОДЗЕ АРГАНІЗАТАРАЎ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЛЁТА У СТРАТАСФЕРУ

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦВК СССР

Адзначаючы бліскучае выкананне задання ўрада арганізатарамі і ўдзельнікамі палёта стратастата «СССР», упісаўшымі новыя галоўныя старонкі ў гісторыю совецкай авіяцыі і вывучэнне стратасферы, а таксама выключную энергію і веданне справы рабочых і кан структараў па пабудове стратастата, прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР пастанаўляе:

УЗНАГАРАДЗІЦЬ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА:

1. ПРАКОФ'ЕВА ГЕОРГІЯ АЛЯКСЕЕВІЧА — камандзіра і ваенкома паветранага дывізіёна — за выдатныя заслугі ў справе арганізацыі і кіраўніцтва палётам у стратасферу ў якасці камандзіра першага ў Саюзе ССР стратастата, дасягнуўшага сусветнага рэкорда вышыні.

2. ГАДУНОВА КАНСТАНЦІНА ДМІТРАВІЧА — начальніка канструктарскага бюро навукова-вопытнага інстытута гумовай прамысловасці за выдатныя заслугі ў канструкцыі стратастата і асабісты ўдзел у палёце ў стратасферу.

3. БІРНБАУМА ЭРНЕСТА КАРЛАВІЧА — памочніка начальніка першага сектара кіраўніцтва базавой падрыхтоўкі УВПС РСЧА — за выдатныя заслугі ў справе арганізацыі палёта ў стратасферу і асабісты ўдзел у палёце ў якасці пілота-лётчика.

4. МАРГОЛІНА СЯМЁНА ЛЯОНЦЬЕВІЧА — дырэктара завода № 39 — за выключныя заслугі ў справе арганізацыі палёта ў стратасферу і непасрэдны асабісты ўдзел у кіраўніцтве пабудовай першага стратастата ў Саюзе ССР.

5. ЧЫЖЭЎСКАГА ВЛАДЗІМІРА АНТОНАВІЧА — начальніка брыгады цэнтральнага канструктарскага бюро завода № 39 — за выдатныя тэхнічныя заслугі пры непасрэдным канструяванні першага ў Саюзе ССР стратастата.

6. МАЙСЕЕВІЧА ІВАНА ГЕОРГІЕВІЧА — рабочага, брыгадзіра завода № 39, праводзіўшага ўласнаручна найбольш адказныя работы на вырабу гандолы стратастата.

7. КУЗІНУ ЕЛЕНУ МІКАЛАЕЎНУ — нач. першай секцыі навукова-даследчага інстытута гумовай прамысловасці — за выдатныя тэхнічныя заслугі пры распрацоўцы тэхналагічнага працэса гандолы і асабісты выраб рэфектуры для яе.

УЗНАГАРАДЗІЦЬ ОРДЭНАМ ЧЫРВОНАЙ ЗВЯЗДЫ:

8. ГАРАКАНІДЗЕ ВЛАДЗІМІРА ГЕОРГІЕВІЧА — інжынера-пілота Дырыжаблябуда — за выключна ўмелую арганізацыю ўсіх работ на старце.

УЗНАГАРАДЗІЦЬ ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА:

9. ЛЕВІЦІНУ ГЕКУ АБРАМАЎНУ — інжынера навукова-даследчага інстытута гумовай прамысловасці — за актыўны ўдзел у загатаўленні рэфектуры абалонкі стратастата і асабліва пільную праверку матэрыялаў у лабараторных умовах.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ.
11 лістапада 1933 г.

АБ УЗНАГАРОДЗЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КАРАКУМСКАГА АЎТАМАБІЛЬНАГА ПРАБЕГА

ПАСТАНОВА ПРЭЗІДЫУМА ЦВК СССР

Адзначаючы ўпартую і герайчную работу ўдзельнікаў аўтапрабега Масква — Кара-Кум — Масква, бліскучым чынам падтрымаўшага рост тэхнічнай магутнасці Совецкага саюза і даказаўшага высокія якасці як совецкіх будаўнікоў і совецкіх аўтамашын, так і совецкай сталі і каўчука, прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР пастанаўляе:

УЗНАГАРАДЗІЦЬ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА:

1. МІРЗЦКАГА АЛЕКСАНДРА МАКОІМАВІЧА — камандора аўтапрабега Масква — Кара-Кум — Масква, — за выключна ўмелую арганізацыю і кіраўніцтва прабегам.

2. ЗХТА ДАВІДА НАВУМАВІЧА — старшыню тэхнічнай камісіі аўтапрабега, забяспечыўшага ўмелае кіраўніцтва і добры тэхнічны стан машын і арганізаваўшага правільны ўлік тэхнічных даных прабега.

3. БЕНЕБОЛЕНСКАГА ВЛАДЗІМІРА ПАЎЛАВІЧА — сакратара парткалектыва прабега і вадзіцеля машыны № 9, лепшага ўдарніка калоны, умеўшага асабістым прыкладам арганізаваць вакол парткалектыва ўдзельнікаў прабега на выкананне пастаўленых перад калонай задач.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

ПУСК ГОМЕЛЬСКАГА ШКЛАГІГАНТА

БУЙНЕЙШЫ У САЮЗЕ ШКЛАЗАВОД

(Ад нашага спецкора)

★ 16 год назад, там, дзе зараз узвышаюцца магутныя карпусы гомельскага шклагіганта, цягнуліся палі маёнка памешчыка барона Нолькена.

У 1930 годзе упершыню застукалі тут сякеры, выраслі рыштаванні. Праз тры гады на месцы былой вёскі Касцюкоўка ўзнік адзін з буйнейшых шкласаводаў Саюза. Пабудаваны новы магутны фарпост пролетарскай дыктатуры. Заваявана новая бліскучая перамога ў барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку.

★ Дзень 10 лістапада — свята працоўных усёй Совецкай Беларусі, усяго Совецкага саюза. Гомель і Менск, Ленінград і Масква, гуты «Комінтэрн» і імя Домбаля, заводы Гомеля, ваенныя часці, калгасы, — усе яны прыслалі сваіх дэлегатаў, каб разам з рабочымі завода адсвяткаваць пуск новага індустрыяльнага гіганта.

★ У суправаджэнні інжынераў госці абыходзяць цэхі, знаёмяцца з тэхналагічным працэсам. Гомельскі шкласавод — адзін з лепшых у Саюзе па сваім абсталяванні, адно з найбольш механізаваных прадпрыемстваў шкляной прамысловасці. І што мае асаблівае значэнне — яго шматлікія каштоўнейшыя машыны і агрэгаты пабудаваны на совецкіх заводах, сваімі сіламі і з совецкіх матэрыялаў.

★ Магутны газагенератарны цэх — сэрца завода. Па сталёвым тросе на эстакадзе ў 30 метраў вышынёй падымаюцца вагаметкі з торфам. Праходзячы праз складаную сістэму генератараў, газаборачы, фільтраў, скуберуў, — цвёрды апал ператвараецца ў высокакаласны газ. Ачышчаны ад смалы, ад розных прымешак, газ нагнятаецца ў ванную печ.

Упершыню ў Совецкім саюзе на газагенератарнай станцыі ўведзена электрычная ачыстка газа, забяспечана магчымасць улаўліваць пабочныя прадукты. Станцыя можа даць краіне высокакаштоўныя смолы і масла розных гатункаў. Першая чарга станцыі — чатыры генератары — ужо ўведзена ў эксплаатацыю, будуюцца яшчэ пяць. Начальнік станцыі тав. Зайчанко знаёміць гасцей з работай гэтага адзінага ў БССР цэха.

★ Доўгая істужка транспарцёра падае пясок у цэхі пыштання корпуса. Сушільныя барабаны... Машыны «Клеро». Сушка, размол, прасейванне пяску і крэйды. Гэта лабараторыя для прыгатавання шыхты — жыўчасці для ванн пей печ. Тут з розных матэрыялаў стварацоць сырэц. Сульфат і вугаль, пясок, крэйда і сода—усё гэта часткі шыхты, патрэбнай для варкі шкла.

Кожная з частак павінна падавацца ў пэўнай прапорцыі — інакш печ не пераварыць, інакш брак. Тут адзіным ў СССР сопернымі вагі для дакладнага вызначэння паасобных частак мешаніны.

1, нарэшце, асноўны цэх — машынна-ванны. Магутная ванная печ і 12 машын «Фурко». Апошняе слова тэхнікі. Гэта першая чарга завода. Будуецца другая печ на 13 машын.

Вакол расце соцыялістычны гарадок. Тры новыя абсталяваныя карпусы з кватэрамі для рабочых. Тэлефонная станцыя, сталоўка.

★ Гомельскі шклагігант — буйнейшы ў Саюзе. 80 вагонаў шкла дае ён у гэтым годзе. 2.700 вагонаў — у 1934 годзе, 20 проц. усёй прадукцыі белмскага шкла ў Саюзе. У два з паловай разы павялічваецца выпуск шкляных вырабаў. Соцыялістычная індустрыялізацыя Совецкай Беларусі робіць новы велізарны крок наперад.

★ Двухтысячны калектыў будаўнікоў і рабочых завода сабраўся ў гэты дзень на мітынг у велізарнай зале, дзе будуецца машынна-ванны цэх другой чаргі. Тут інжынеры і тэхнікі завода, тут яго лепшыя ўдарнікі. З вялікім уздымам прымаюць ліст тав. СТАЛІНУ. Рабочыя просяць падаць заводу імя тав. Сталіна — геніяльнага правадыра сусветнай рэвалюцыі. Яны абавязваюцца апрацаваць пазку сталінцаў. Яны добра разумеюць, што гэта ганаровае імя дасцца недарма, яны абавязваюцца працаваць з найбольшай самаадданасцю і гераізмам, зрабіць завод лепшым прадпрыемствам Саюза.

Начальнік будаўніцтва інжынер ЕМЕЛЬЯНАЎ, дырэктар завода тав. ГОРЦАЎ, галоўны інжынер, стары рабочы-шкладуў тав. ВАЙЦЭХОЎСКІ раз горпаюць перад сабраўшымісія на мітынгу карціну герайчных спраў, большэвіцкай барацьбы за хутчэйшае скапчанне будаўніцтва.

Большэвікі шклабуда ўначатлілі гераізм мас, разгарнулі магутны ўдарны рух, які дазволіў завоёць складаную тэхніку будаўніцтва і мантажа.

Выключную ролю ва ўстаноўцы газагенератараў альтраў комуніст ЧЭКАНАЎ. Не гледзячы на трудносці, ён упэўнена давёў справу да канца.

З большэвіцкай наварыстасцю і энтузіязмам змагаліся за высокакласны мантаж ванны комуністы ШУМІЛІН і САМОЙЛАЎ.

Ударнік-большэвік тав. МІШЧАНКА сваім асабістым прыкладам узняў масы на барацьбу за высокія тэмпы і якасць жыллёвага будаўніцтва.

На пляцоўцы шклабуда вырас і загартаваўся кадр лепшых рабочых і тэхнікаў.

Вось 50-гадовы ветэран брыгадзір ВАСІЛЬВІНАГРАДСКІ. Даём і поччу, не ведаючы стомы, яго брыгада змагалася на самых цяжкіх, самых небяспечных участках. Вось тэхнік-будаўнік ЯША ПАПОЎ. Радавым чорнарабочым прыйшоў ён на пляцоўку. Ён вырас, стаў тэхнікам, памочнікам прараба. Лепшы арганізатар вытворчасці, ударнік з ударнікаў — так атэстуе яго калектыў.

Вось тав. КЛІМАЎ. Увесь шлях ад чорнарабочага да кваліфікаванага брыгадзіра прайшоў ён на пабудове. Яго апошняя работа — мантаж калектара — прызнана дасканалай. Вось брыгада мантажнікаў тав. РАЗУМЕЕВА. Яе самаахвярная адданасць, яе гераізм былі прыкладам для ўсіх.

Важнейшай умовай, забяспечыўшай пуск завода ў дні Кастрычніцкіх свят, з'явілася таксама канкрэтнае штодзённае кіраўніцтва гомельскай партарганізацыі і пролетарскае падтрыманне рабочых гомельскіх заводаў.

★ Партыя і ўрад высока ацанілі работу героя шклабуда. У спецыяльным загадзе наркамлёгпрам СССР тав. ЛЮБІМАЎ адзначыў узорную баявую работу будаўнікоў гіганта, забяспечыўшую пуск адного з найбольш буйных і механізаваных прадпрыемстваў Саюза Нам. наркома лёгкай прамысловасці СССР тав. ЛЕВІН зачытаў доўгі спіс інжынераў, тэхнікаў і ўдарнікаў, атрымаўшых прэмі.

Начальнік будаўніцтва, інжынер ЕМЕЛЬЯНАЎ узнагароджан лёгкавой машынай і 2.000 руб. Па 2.000 рублёў і імянныя сегнёты атрымалі дырэктар завода тав. ГОРЦАЎ, нам. дырэктара тав. АМЕР, галоўны інжынер ВАЙЦЭХОЎСКІ, аўтар праекта завода інжынер КАЗАНСКІ. Кантроўныя прэмі выданы таксама інжынеру СПІРЫДОНАВУ, членам урадавай прыёмнай камісіі ТРУСАВУ і ДАБРАВОЛЬСКАМУ. Узнагароджаны таксама сакратар калектыва ШАЛІХІН і старшыня ФЗК КЛІМОВІЧ. Па 500 руб. і ганёшпуры атрымалі лепшыя ўдарнікі ШУБІН і ПАПОЎ.

Усяго выдана прэмій на 75.000 рублёў і шмат каштоўных рэчаў.

Тав. Левін абвяшчае, што наркамат узняў хадайніцтва аб устанаўленні на заводзе дошкі гонара лепшых!!! і ўдарнікаў.

★ Адзін за другім выступаюць прамоўцы. Цучнымі воплескамі сустракаюць рабочыя апытальныя прамовы т. т. ЖЭБРОЎСКАГА, ГАЛАДЗЕДА, ЧАРВЯКОВА і сакратара гомельскага гаркома т. ШАФАРЭНКА. Яны гаворыць аб велізарным значэнні новай перамогі. На месцы самадуўных майстэрань і заводзікаў дзяржволюшчына! Беларусі вырастаюць дзесяткі гігантаў прадпрыемстваў. Набудова гомельскага завода паказвае, што працоўныя Совецкага саюза здолелі асвоіць самыя апошнія дасягненні сусветнай навукі і тэхнікі. Пабудова шклагіганта — новае магутнае дэманстраванне правільнасці генеральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Перад рабочымі завода стаяць зараз дзве асноўныя задачы — у самы кароткі тэрмін асвоіць складаныя механізмы, даць высокакласнае бемаслае шкло, пусціць завод на поўную праектную магутнасць першай чаргі і да пачатку студзеня 1934 года ўвесці ў эксплаатацыю другую чаргу. Гэтыя важнейшыя задачы патрабуюць шалёх-яка большэвіцкіх тэмпаў работы, такой-жа самаадданасці і энтузіязма, якія былі праяўлены на пракладцы апошніх трох год. Энтузіязм будаўніцтва даможыць шафасам асвоеныя новай тэхнікі!

БУТОМАЎ.

ЗАВАЯВАЦЬ ПРАВА НА УДЗЕЛ ВА УСЕБЕЛАРУСКІМ З'ЕЗДЗЕ ПЕРАДАВЫХ ІЛЬНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ

Мабілізаваць усіх калгаснікаў на барацьбу за высокую якасць ільнавалакна

Баяздольнасць кожнай партыйнай, комсамольскай і совецкай арганізацыі Ільняных раёнаў будзе ацэньвацца па якасных і колькасных паказальніках апрацоўкі і загатоўкі ільну і канапель

ШЛЯХ ДА ВЫСОКАЯКАСНАГА ВАЛАКНА

ПОЛАЦАК. (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

Урокі леташняй ільназагатоўчай кампаніі многаму навучылі Полаччыну.

Па-першае, план здачы ільнасемя да 1 лістапада выкананы на 100,1 проц., па-другое, у гэтым годзе непараўнальна вышэйшыя тэмпы загатовак ільнавалакна і трасты, а таллоўнае — здадзеная ільнапрадукцыя значна лепшай якасці.

Самапёкам гэтыя поспехі не прышлі. Райком партыі і райвыканком, палітаддзелы полацкай і вятрынскай МТС па-большэвіцку арганізоўваюць калгасныя масы на барацьбу за высокаякасную ільнапрадукцыю, за датэрміновае выкананне абавязкаў перад дзяржавай.

Вельмі характэрнае пераўтварэнне. Ветрынская МТС летась злачыла пра валіла ільназагатоўкі. А сёлета, над кіраўніцтвам палітаддзела Ветрынская МТС выходзіць у рады перадавікоў. Вось прыклад. Калгасы Ветрынскага сельсавета на 1 лістапада план ільназагатовак выканалі на 98,6 проц., а па ільнасемі — на 101,4 проц.; калгасы Астроўнічнскага сельсавета адправедна: 56,7 проц., 93,4 проц.; Рушынскага сельсавета — 41,1 проц., 103,2 проц. і г. д.

Гіганцкі крок наперад зрабілі і калгасы Полацкай МТС. Узяць калгас ІМЯ ЛЕКЕРТА, Шацілаўскага сельсавета. Тут у мінулым годзе частка ільну была вагнёсена, большая-ж частка валакна здавалася 4 нумарам і нізкай.

А сёлета? Сёлета калгас імя Лекерта, абавязаўшыся па кантрактацыйным дагаворы здаваць валакно № 7, здае № № 10, 12 і нават № 14.

Узорна арганізавана перапрацоўка ільну. Безупынна сучыцца траста ў 3-х еўнях. Мяцёр ідзе круглыя суткі на адной трохвальнай конпай мялцы. З-пад мялкі лён ачышчаецца ад кастрыцы, потым адлежваецца суткідвое і затым ідзе ў сталую апрацоўку — трапанне.

Арганізавана інспекцыя якасці. Інспектар якасці Міхайлоўская Хрысціна (яна-ж трапальшчыца-ўдарніца) тут-жа на пункце сочыць за якасцю трапання. Трапальшчыцай працуе 1 партарганізатар т. Сабаленка Алена — дэлегатка 1-га ўсесаюзнага і ўсебеларускага з'ездаў калгаснікаў-ударнікаў. Сваім асабістым прыкладам Сабаленка Алена і Міхайлоўская Хрысціна паказваюць узоры ўдарнай і высокаякаснай працы. А ў перапынкі ідзе чытка газет.

Ня дзіва таму, што ў калгас імя Лекерта сёлета ідуць вучыцца як апрацоўваць лён не толькі аднаасобнікі, але і нова-арганізаваныя калгасы.

Пасля трапання лён сартуецца па гатунках і перавязваецца, як патрабуюць спецыялісты.

Не адзін калгас імя Лекерта пад кіраўніцтвам палітаддзела МТС вышаў з адсталых у перадавыя, ачысціўшыся ад класава-варожых элементаў, правільна арганізаваўшы працу.

Узорна змагаецца за лён і калгас «Социялістычная вёска», таго-ж сельсавета.

Мы прысутнічалі на загатоўцы, калі гэты калгас прыязджаў здаваць возільна. Прыкладная апрацоўка валакна — чыста абтрапанае, нівотная кастрыцкі, роўна абцяпнута, моцна падвязана.

Адзнака спецыяліста — № 11 — случная адзнака.

Інспектар Загатзільна т. Эціна, які таксама прысутнічаў на загатоўцы, прыязджаў, што прыёмчык Полацкага загатоўпункта Бодня проста працае па 2 нумары, напрыклад: трэба вызначыць № 11, вызначае № 9. Гэта злачынства.

І таму адзіная тактыка інспектара Загатзільна тав. Эціна, які абмяжоўваўся заўвагай прыёмчыку Бодня па-таварыску, на вушка, па-сямейнаму.

І яшчэ адна характэрная рыса «работы» прыёмчыкаў. Некаторыя калгасы, напрыклад, «Чырвоная паляна», Алесаўскага сельсавета, прывозяць дрэнна апрацаваны і не падвязаны як належыць лён. Загатоўчык Бодня бракуе, адпраўляе назад, але не вучыць, як-жа трэба зрабіць. І толькі пасля заўвагі інспектара Эціна прыёмчык Бодня неахвотна паказвае, што з гэтым ільном трэба зрабіць.

Іменна таму, што загатоўчы апарат спецыялістаў не перастроіў яшчэ сваю працу, не ідзе ў масы, не вучыць, як трэба апрацоўваць лён на мялна-трапальным пункце, — рад калгасаў не дае той якасці валакна, якую ён можа даць.

Вось прыклад — калгас імя Сталіна, Юраўшчкага сельсавета. Тут як ні б'юцца чыста трапаць лён, а вышэй 9 нумара атрымаць не могуць. Чаму? Таму, што лён «направільна абцягваецца, пухлічцца ў макушках, валакністыя часткі перамешаны з кусцёлямі.

Варта было паказаць трапальшчыцам, як правільна абцяпваць лён і расслумачыць, што дорага чыстае валакно, правільна абцяпнутае, — як яны адразу перастроіліся і сталі даваць лепшую якасць.

Далёка не ўсё зроблена ў Полацкім раёне, каб дабіцца вышэйшай якасці апрацоўкі ільну. Яшчэ далёка не ўсе калгаснікі ведаюць тое, што пры невыкананні дагавора па якасці, яны павінны будуць здаць большую колькасць валакна.

Нарэшце, слаба папулярызаваны такія прыклады, якія даў калгас ІМЯ СТАЛІНА, Малаастраўскага сельсавета. Гэты калгас павоцле дагавора павінен быў здаць 18 цэнтн. валакна № 7, а здаў увесь лён у сярэднім № 11. Ён атрымаў 1.170 руб. грашыма, 23,4 цэнтн. жыта, на 1.170 руб. прамтавараў і г. д.

Што атрымалі калгаснікі, якія працавалі на ільне,—нічога гэтага не паказала раённая газета «Чырвоная Полаччына», якая змясціла кароткую інфармацыю.

А трэба ведаць, што ў асобных калгасах Полаччыны папыраецца шкодная думка аб тым, што хлеб, атрыманы за лён, трэба дзяліць на усіх, хто і не працаваў на ільне. Гэта простае парушэнне дырэктыў партыі і ўрада.

Знічыць паказаныя недахопы ў барацьбе за высокую якасць ільнапрадукцыі, шырэй папулярызаваць лепшыя ўзоры апрацоўкі ільну— і Полаччына зможа стаць сапраўды вядучым ільнаводчым раёнам.

А. МІКУЦКІ.

АРШАНШЧЫНА МОЖА І ПА ІЛЬНУ БЫЦЬ НА ПЕРАДЗЕ

ОРША. (Наш. кар.).

Калгасы і аднаасобнікі Аршаншчыны павінны па кантрактацыйных дагаворах здаць дзяржаве звыш 670 тон ільнавалакна. А здалі па 5 лістапада толькі каля 80 тон—11,5 проц.

Лепа, што вакол апрацоўкі і здачы дзяржаве ільну не створана належная грамадская думка. Раён меў усе магчымасці здаць значна больш валакна. Гэта неабвержна даказвае практыка перадавых сельсоветаў і калгасаў. Напрыклад, Баранскі сельсавет план здачы ільнавалакна выканаў на 54 проц., Яромкаві



Помнік В. І. Леніну ў Менску

Работы скульптара Манізера. Пастаўлен на плацы Леніна ля Дома ўрада. Помнік зроблен са сплава бронзы і медзі (фігура Леніна) і граніта (п'едэстал).

М. Вішнеўскі

Ім шаснаццаць год

Вечар быў мнагалюдны, жвавы і юны. За доўгімі сталамі рэдакцыйнай сталовай з грудамі закусак сядзелі, з усмешлівымі блазюсымі тварамі тыя, каму сёння споўнілася шаснаццаць год. Упершыню сабралі іх з фабзавучаў і школ, тэхнікумаў і фабрык і папраслі расказаць аб сваім жыцці.

— Нарадзіўся я ў 1917 годзе, разам з вялікім Кастрычнікам, — пачынае кожны з іх: — бацька рабочы, я зараз комсамолец, вучуся на механіка.

— Я канчаю дзевяцігодку...

— Вучуся на 2-м курсе музычнай кансерваторыі.

І гэтак усе... Вучуся, працую, гуляю... І ні слова пра мінулае, якое-б бяздарна загубіла іх дзяцінства і аб якім так часта з гнявам на твары ўспамінаюць іх бацькі.

Але адна з іх напомніла і пра пёс дзяцей рабочых і сялян капіталістычных краін.

— Маё дзяцінства было непадобным да вашага, — гаворыць Путчанская. Дзевяць месяцаў таму назад я прыехала з капіталістычнай Польшчы. Бацька мой рабочы, стары большэвік, зараз па кутуе ў фашысцкай турме. У Польшчы пануе вялікае беспрацоўе, дзеці рабочых галадаюць і не могуць так, як вы, вучыцца. У навучальныя ўстановы яўрэяў і беларусаў не прымаюць. За вучобу трэба плаціць. Тут у БССР зусім інакш. Кожны вучыцца на сваёй роднай мове, у школе гарачыя снеданні, бясплатная вучоба. Там дзяцей не допускаюць да грамадскай работы, набіваюць ім галовы розным рэлігійным хлусцёй. Там дзеці не могуць развіваць сваіх здольнасцей. У совецкай школе я зараз вучуся і прымаю актыўны ўдзел у грамадскай рабоце. Стала піянеркай. Я добра пераканалася, што толькі ў Совецкім саюзе дзеці — поўнацэнныя будаўнікі социялістычнага грамадства і ім належыць бліскучая будучыня.

Вось аб будучыне бліскучай і напоўнай шматлікіх рэвеснікаў Кастрычніка і будзе слова.

***

Седзячы за хатнім рабочым сталом Гершман Маргарыты, здзіўляешся той упартасці, з якою пакаленне Кастрычніка вывучае культуру мінулага. У яе сшытках, альбомах і чарцяжах збываецца заветная мара Леніна аб усебаковым развіцці культурных, свядомых будаўнікоў социялізма.

У Маргарыты на рабочым стале пяжаць творы класікаў музыкі. З васьмі год яна іх вывучае, пазнае таямнасць і сакрэты ў творчасці Шапена і Ліста, Бетховена і і Моцарта, Чайкоўскага і Грыга, каб самой стварыць адно з эмацыянальных мастацтваў чалавецтва — музыку. Ёй гэта паспяхова дасцца. Да 16 год яна паспела ўжо скончыць музычны тэхнікум і зараз навучаецца на другім курсе музычнай кансерваторыі па класу фартэп'яна.

Так заўзята вывучае Маргарыта не толькі творы класікаў музыкі. Тут-жа на стале ляжаць і творы класікаў пролетарскай рэвалюцыі Карла Маркса, Фрыдрыха Энгельса, Леніна, падручнікі па дыялектычнаму матэрыялізму, літаратуры, фізіцы, фізіялогіі, хіміі. Маргарыта і іх вывучае. Яна ўжо зараз добра ўсвядоміла і разумее, што без рэвалюцыйнай тэорыі яе практыка па музыцы будзе слепой.

Кожны дзень яна праводзіць у напружанай вучобе. Гуляе Маргарыта мала. Апрача кансерваторыі яна навучаецца яшчэ ў восьмай групе ФЗС і з такім-жа поспехам асвойвае радыётэхніку, тэхніку спісарскай справы, як і тэхніку класікаў музыкі.

— У яе залатыя рукі, — гаворыць маці і паказае тонка сталочаныя яе рукамі ў школьнай політэхнічнай майстэрні металічныя часткі. На стале валяецца чарцёж навейшага радыёпрыёмніка, у маляўнічых сшытках і альбомах відны рысункі, эскізы.

— Скончу кансерваторыю, — заўважае яна, — абавязкова паеду вучыцца ў маскоўскую музычную акадэмію.

***

Як толькі Пармон Косця вышаў на трыбуну і стаў расказваць, як ён навучыўся прымаць апаросы, у залі ўсе засмяяліся. Косця насупіўся, строга зірнуў на прысутных і яшчэ раз паўтарыў:

— Не верыце? У нашай комсамольскай брыгадзе на свінаферме саўгаса Кухцічы ўсе комсамольцы вывучылі зоаветмінімум і тэхніку свінога аўкцыёна. Мне зараз 16 год, я ня таксама асвоіў і праводжу ў жыццё. Наша брыгада добра і ўмела даглядае маладняк, у выніку чаго адыход яго знізіўся да мінімума. За гэта мы маем пераходны чырвоны сцяг.

І адразу стала ціха. Косця набраўся духу і як стары, вопытны свінар пачаў падрабязна апавядаць злёту аб крапатлівай штодзённай рабоце ўдарнай комсамольскай брыгады па свінаферме.

— Мы любім свіней, ведаем, чым дыхае кожнае парася, таму і адыход невялікі.

Пасыпаліся пытанні аб тых, хто няўмелым доглядам павышае процант адыходу маладняка.

— Падкормку мінеральную даеце?

— А як-жа, кожны дзень. Нельга найдаць парасят без мінеральнай падкормкі, яна ім патрэбна, як паветра.

Косця яшчэ доўга перадаваў вопыт работы сваёй брыгады, тлумачыў злёту, як трэба выхоўваць маладняк. Без іроніі і насмешак усе слухалі яго з увагай.

На злёце Косцю прэміявалі 200 руб., а яго брыгаду — 4-месячным кабаном. Ён расхваляваўся, выступіў і голасна заявіў:

— Сёння я — свінар ударнай комсамольскай брыгады, мая мэта праз два гады стаць дырэктарам фермы. Штодзённай вучобай я абавязкова дабіўся гэтага і буду кіраваць фабрыкай мяса.

***

Чарнушэвіч Маня, вучаніца 9-й групы 20 ФЗС разам са сваімі таварышамі выкрыла ў стандартным падручніку па геометрыі грубую памылку. Тэарэма гаворыць, што дзве скрыжаваныя прамыя ляжаць абавязкова ў паралельных плоскасцях. Нягадкі раз праверыўшы і грунтоўна пераканаўшыся ў няправільнасці тэарэмы Маня напісала з таварышкамі заяву і падала яе ў выдавецтва.

— Прафесар ужо прызнаў, — гаворыць яна зараз, — што тут была памылка. Толькі з другой тэарэмай не згадзіцца, аб якой мы таксама напісалі, кажа, трэба на совеце разгледзець.

У школе Маня арганізоўвае ўсю масавую работу. Увесь дзень у яе працякае ў гуртках, гульнях, вучобе. Але асноўнае ў яе — вучоба. У школе яна — першы пучань, заданні заўсёды здае на «вельмі добра».

Бацька Мані, Чарнушэвіч Зміцер, гаворыць, што ён у такім узросце быў яшчэ нелісьменным, вучыўся шыць абутак. А маці Алёна зусім проста заўважае:

— Я калі была такой, дык ведала толькі з носа ды ў рот. А яна ўжо на інжынера кейкага меціць.

Алёна Чарнушэвіч кепісьменная і дзеці за яе чырванеюць, называюць адсталай. Маня зараз рыхтуецца трымаць экзамен у будаўнічы інстытут.

— Інжынерам хачу быць, — упэўнена гаворыць яна, — каб будаваць гарады і фабрыкі ў бясклясавым социялістычным грамадстве.

***

Хто ім не паверыць такім, як Маргарыта, Косця, Маня, што яны будуць вучыцца ў акадэміях, кіраваць фабрыкамі і заводамі, будаваць блазітныя гарады комуністычнага грамадства?

Іх мільёны народжаных Кастрычнікам і растучых разам з краінай, упарта будуючай социялізм. У школах, фабзавучах, бібліятэках і майстэрнях яны вучацца, завяўваюць вяршыні чалавечай культуры, каб умела будаваць і кіраваць краінай.

У сваю будучыню яны вераць цвёрда і бачаць яе, бо вераць у бясспрэчную пабудову ў другой пяцігодцы бясклясавага грамадства.

Прэміяванне за паспяховае выкананне фінплана

МЕНСК, наркому фінансаў т. ХАЦКЕВІЧУ.

За паспяховую работу па фінплану ў трэцім квартале Наркамфін Союза прэміраваў ударнікаў фінфронта БССР 5 веласіпедамі і 25 тыс. руб.

Упэўнен, што ў чацвертым квартале ўдарнікі фінфронта і фінансава-крэдытнай сістэмы БССР будуць таксама паболышэвіцку змагацца за фінплан і забяспечаць яго выкананне па кожнаму плацяжу.

ГРЫНЬКО.

Фінплан чацвертага квартала выканаем датэрмінова

МАСКВА, наркому фінансаў Союза т. ГРЫНЬКО.

У адказ на прэміраванне вашы фінударнікаў БССР за паспяховае выкананне [illegible] няю ад імя ўсіх арганізацый і фінансава-га актыва Беларусі аб датэрміновым выкананні фінплана 4-га квартала.

[illegible]

Чыстка партыі

УСЯМЕРНА ПАВЫШАЮЧЫ УДЗЕЛ ШЫРОКІХ МАС У ЧЫСТЦЫ, ДАПАМАГАЦЬ КАМІСІЯМ АЧЫСЦІЦЬ ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ АД КЛАСАВА-ЧУЖЫХ, БУРЖУАЗНА-ПЕРАРАДЖЭНСКІХ ЭЛЕМЕНТАЎ

Выкараніць да канца нацдэмаўскае ахвосце

Чыстка партыйнай ячэйкі Чэрвеньскага гарсовета скончана. Вынікі чыстки ясна паказваюць, што ячэйка з усклад зенымі на яе задачамі не справілася.

У складзе ячэйкі знаходзіцца амаль увесь раённы актыў. Здавалася-б, што такая ячэйка павінна быць прыкладам другім ячэйкам раёна. Ячэйка сваю работу праводзіла бесплана ва, сходы праводзіла замкнута, без прысутнасці беспартыйных працоўных горада. Актыў вакол ячэйкі не згуртоўвае.

Асноўная ўвага ячэйкі павінна была быць накіравана на работу гарсовета і яго сведняў. Але бюро ячэйкі займалася дэкларацыямі, а не практычнай работай. Арганізацыйна-масавая работа гарсовета ў загоне. Секцыі і дэпутацкія групы не працуюць, комуністы—члены секцый—бяздзейнічаюць, бюро ячэйкі ніякіх мер не прымала.

Калгас «Большэвік»—адзіны на тэрыторыі горада, між тым з боку ячэйкі не ацэнены ўвагі яму. Уборка пра ведзена зусім дрэнна, з вялікімі страта мі. Не скошанай засталася сёмаюць сенажаць. 3-са дзяцінна дагляда загінуў конь і карова і вінаваты ў гэтым не прыцягнуты да адказнасці. Пасобным калгаснікам працадні налічваліся нерэгулярна.

У абслугоўванні гарсовецкай ячэйкі знаходзіцца яўрэйская і беларуская ШКМ і польская школа. На гэты адказны ўчастак работы ячэйка таксама не звярнула належнай увагі. У выніку гэтага ў польскай школе з 27 вучняў толькі 4 не з'яўляюцца дзецьмі класава-варожых элементаў (спекулянтаў, кулакоў, паліцэйскіх). Загадчык гэтай школы—сын кулака.

Склад ячэйкі засмечан класава-варожымі элементам, якія выкарыстоўвалі партыю ў сваіх асабістых інтарэсах. Іх камісія выкрыла і выгнала вон з партыі. **Тарасін Алесь.** Да 1929 года меў у гаспадарцы 48 га зямлі, 8 коней, 12 кароў і каля 30 штук дробнай жывёлы. Тарасік пры ўступленні ў партыю скрыў свае соцпастаўленічта. Ён скрыў і тое, што яго брат Мікіта ў часе белапольскай акупацыі тэрарызаваў і рабаваў насельніцтва.

Тэйф. Працуючы на пасадзе інспектара працы, забараняў знімаць з працы лішанцаў, а знятых з работы заставіў зноў прымаць. Тэйф устроіў на работу ў совецкай установе сваю сястру, пазбаўленую выбарчых правоў. Увесь час жыве з сваёй цёшчай (буйная гандлярка, таксама па збаўленая выбарчых правоў).

Настаўнік польскай школы **Рудзінскі** прабаваў чыстку партыі выкарыстаць для ідэйнага ацкоўвання «Беларускай грамады» і ПІС. Гэтыя партыі ён характарызаваў, як рэвалюцыйныя і што паміж імі і компартыяй ніякай розніцы няма. Рудзінскі, былы грамадавец, нават рэдактар «Беларускай Социялістычнай грамады», прышоў у комуністычную партыю не разброеўшым сл. Ён ні разу не выкрываў контрэвалюцыйную сутнасць «Бел. Грам.» і ПІС.

Член бюро яч. КП(б)Б, заг. аргадзела РК **Школьнікаў** імкнуўся падтрымаць Рудзінскага, даказваючы, што «Бел. Грамада» была «рэвалюцыйнай».

Што з'яўляецца прычынай таму, што Школьнікаў так яра абараняў ПІС? Прычына ў тым, што Школьнікаў выхадзец з дробна-буржуазнай сям'і. Яго бацька доўгі час быў мелямедам і трымаў цраляню з наёмнымі рабочымі. Сам Школьнікаў, пасля скончэння хедэра, разам з братам уступіў у сіяніцкую контррэвалюцыйную арганізацыю (С-С і ЕСС).

Не гледзячы на вялікі час пробывання яго ў радах компартыі (з 1919 года), Школьнікаў усё-ж не разброіўся, у яго да апошняга часу праяўляюцца антыпартыйныя адрыжкі.

Школьнікаў з'яўляецца партпрымацаваным да ячэйкі фабрыкі «Праца». На гэтай фабрыцы сярод рабочых былым фабрыкантам Каменецкім праводзілася контррэвалюцыйная агітацыя. Школьнікаў ведаў аб гэтым, але не прыняў належных захадаў, каб выкрыць класавага ворага.

На сходзе па чыстцы ячэйкі гарсовета штодзённа прысутнічала да 500 чалавек. Комуністы і беспартыйны актыў Чэрвеня дапамаглі выкрыць тушкаў з партбілетамі ў кішэні. Трэба спадзявацца, штоачысцілася ад класава-варожых, прымакаўшыхся элементаў, партарганізацыя чэрвеньскага гарсовета хутка пераможа свае недахопы, паклаўшы ў аснову сваёй работы прапановы правяркома.

Л. Юшкевіч.

Ажыццявіць практычныя ўказанні правяркома

Скончылася чыстка вясковых партячэек Любанскага раёна. Першыя дні чысткі, з прычыны слабай падрыхтоўкі праходзілі пры няпэўнай актыўнасці прысутных. І толькі ў працэсе чысткі, пасля выезда раённых работнікаў у вёску для правядзення растлумачальнай работы, актыўнасць значна ўзнялася. Калі на чыстцы першых 9 ячэек выступілі ў спрэчках 12 партыйцаў, 5 комсамольцаў і 12 беспартыйных, то на чыстцы наступных 6 ячэек выступіла партыйцаў 24, комсамольцаў 13 і беспартыйных 21.

Пры дапамозе беспартыйнага актыва, комсамольцаў і ўсёй масы комуністаў камісія ў асобных ячэйках выкрыла разлажэнне, сямейнасць, круговую паруку і апартуністычныя справы. **Рэчанская** сельская тэрытарыяльная ячэйка налічвала 11 комуністаў. З іх 6 чал. на чале з сакратаром ячэйкі выключаны з партыі.

Гэта група крымзаўшыхся да партыі людзей на чале з былым эсерам **Пятроўскім** пінствавала з кулакамі, укрывала іх ад абкладання. «Комуніст» **Філота** — сын былога ўпраўляючага казённым лесам, меўшага 30 дзесяцін зямлі, хуліган і п'яніца, разам з кулацкім прыхлебальнікам былым старшынёй калгаса «**Буджённік**» **Мікулічам** шаліі калгаснае збожжа, ашуквалі партыю, займаліся «очковтирательством». Недасеяўшы 25 га, яны рапартавалі аб поўным выкананні плана сеўбы.

Недалёка адышоў ад іх старшыня сельсовета **Савіцкі**. Ён на адным пасяджэнні прэзідыума апітраваў 50 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у той-жа час зусім не заварушу кулакоў, злоўна не здаваўшых збожжа дзяржаве.

Гэтыя справы праходзілі міма палітычнага кіраўніка—сакратара парт'ячэйкі Курбацкага. Не арганізуючы ніякай масавай работы, ён па пачах пуляў, а яні аддаваў непрабудзнаму сну. На чыстцы гэты кіраўнік імкнуўся зваліць усе прарывы на «аб'ектыўныя» прычыны (дажджы, недахоп рабочых рук і г. д.).

За такую «работу» ячэйкі вясе адказнасць і раённае кіраўніцтва. **Курбацкі** не справіўся з работай загадчыка агітпасавым аддзелам РК, не глядзячы на гэта, апошні накіраваў яго на адказную работу ў вёску сакратаром ячэйкі.

Моцны палітычны ўрок дала чыстка ячэйкі лугтаса «**Загалле**». Там на працягу доўгага часу арудавала група шкоднікаў, актыўны ўдзел у «работе» якой прымалі людзі з партыйным білетам ў кішэні. Заг. трактарным паркам, былы дезертыр з Чырвонай арміі — кулак **Сівак**, сабраў вакол сябе рвачоў-лодыраў (**Рзменьска, Клемятніка** і інш.), якія, карыстаючыся бядзейнасцю «ліпш», жыў сядзелі ў партыйным кіраўніцтве (**Міхайлаў, Кадыш, Савельеў і Гузік**), і палітычнай слепатой работнікаў лугавога трэста, гаспраляваўшых у саўгас, разбуралі гаспадарку, псавалі трактары і с.-г. машыны, знішчалі гаручае, шаілі сена і збожжавыя культуры. З 10 чал. усяго склада ячэйкі выключана з партыі 5 чал.

У ходзе чысткі выявілася, што некаторыя парт'ячэйкі не зразумелі палітычнай важнасці арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў. Каб «рапартаваць» аб поўным выкананні плана збожжазаставаў, асобныя «кіраўнікі» загадвалі адным калгасам здаваць збожжа за іншыя (Юшкаўская сельская тэрытарыяльная ячэйка, сакратар т. Дастанка і інш.). Калгас імя Фрунзе здаў за калгас «Новы шлях» 400 пуд. жыта, а калгас «Ленінскі шлях» — 150 пуд. аўса.

Побач з разгорнутым здаровай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі былі выпадкі, калі асобныя кулацкія элементы імкнуліся выкарыстаць чыстку для дыскрэдытацыі добрых комуністаў. На партыйцаў — старшынь калгасаў (**Турокская, Асавецкая, Яменская** тэрытарыяльныя ячэйкі), якія былі бязлітасны да лодыраў, злодзеяў і падкулачнікаў, в боку апошніх ліліся патокі хлусні, але ўсё гэта тут-жа выкрывалася актывам калгаснікаў.

Кулак, пазбаўлены магчымасці выступаць сам, скарыстоўваў у сваіх мэтах падкулачнікаў. Так, студэнты, выгнаным з вышэйшых навучальных устаноў — **Данільчык** (калгас «**Першае жніўня**»), **Анісаў** (калгас «**Пролетарый**») і інш., не жадаючы працаваць, падбіралі «матэрыял», выкарыстоўвалі сваю красамоўнасць для падрыва аўтарытэта комуністаў. Напрыклад, у сваім выступленні **Данільчык** гаварыў, што комуніст **Жартун** бяро хабар, між тым нічога падобнага ніколі не было.

Былі таксама і выступленні лодыраў. Гр. **Цыцэна** (калгас «**Чырвоны комунар**») выступіў з заявай на члена партыі т. **Прушака** — старшыню калгаса, што быццам ён паходзіць з кулацкай сям'і, быў бандытам. Калгаснікі не далі яму дагаварыць, абвяргаючы і выкрываючы яго, як лодыра, падкулачніка. Калгасніца **Бяліцкая** заявіла: «дзякуючы рабоце тав. **Прушака, у нас даходнасць на працадзень павысілася, мы выканалі ўсе свае абавязацельствы перад дзяржавай. Дысцыпліна страшна не нам, а лодырам».**

Чыстка, шмат чаго дала вясковым комуністам. Практычныя ўказанні правяркомаў з'яўляцца праграмай іх дзейнасці. На выкананне гэтых указанняў трэба мабілізаваць увагу ўсёй раённай партарганізацыі.

І. ГРАЗНОЎ.

(Старшыня Любанскай раённай камісіі па чыстцы КП(б)Б)

ДА АДКАЗНАСЦІ ПАРУШАЛЬНІКАЎ РЭВОЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

(Ліст у рэдакцыю «Звязды»)

У 1930 г. жыллёва-будаўнічаму кааператыву «Чырвоны чыгуначнік» быў перадан гарсоветам пачаты будаўніцтвам па Маскоўскай вуліцы ў Менску двухкварцусны дом на 112 кватэр. Паколькі асноўная група пайшчыкаў — чыгуначнікі — былі да таго часу ўжо расселены ў новапабудаваным пасёлку на Брылеўскім завулку, пазвы ўзносы на новае будаўніцтва паступалі вельмі слаба. Будаўніцтва апынулася ў ніякім фінансавым становішчы. Тады ЖБКТ «Чырвоны чыгуначнік», уваходзіўшае ў агульную сістэму гарадской жылкааперацыі, па дырэктыве Белжылсаюза і менскага гаржылсаюза, абавязала аб прыёме ў пайшчыкі і нечыгуначнікаў. У кааператыў уступілі многія рабочыя мясцовых фабрык і заводаў і работнікі ўстаноў.

Увесну 1932 г. пры ўдзеле б. нам. старшыні гарсовета тав. Мядзка кватэры былі на агульным сходзе кааператыва размеркаваны паміж пайшчыкамі. Тыя з пайшчыкаў, якім кватэры дасталіся ў закончаным корпусе, неадкладна засяліліся, а астатнія сталі чакаць скончэння другога корпуса, маючы замацаваныя за сабой [illegible] У верасні бягучага года, калі будаўніцтва другога корпуса стала падыходзіць к канцу, праўленне кааператыва выдзеліла камісію для прагляду запеўдзяканага ранней спіса жыхароў другога корпуса, с мэтай уключэння ў яго новых пайшчыкаў замест некаторых на розных прычынах выбыўшых з кааператыва.

Між тым, 17-га кастрычніка 1933 года ў Менск прыехаў інструктар даржылсаюза тав. Калінін і без наведамлення членаў кааператыва — нечыгуначнікаў і нават членаў праўлення, склікаў сход пайшчыкаў-чыгуначнікаў і абвясціў яго агульным сходам. На сходзе паставілі пытанне кааператыва аб роспуску праўлення і апуляванні ранейшага спіса размеркавання кватэр. Пасля даклада старшыні ЖБКТ тав. Раманкевіча сход гэту прапанову прыняў.

Цэлер тав. Раманкевіч апнаасобна, без водома праўлення кааператыва і камісіі па вылучэнню спіса жыхароў, склаў новы спіс кандыдатаў для ўселення ў другі корпус, які заканчваецца будаўніцтвам. Большасць з гэтых кандыдатаў [illegible] ў кааператыў праз год і пазней, пасля таго як старшыні пайшчыкамі, і ўнеслі толькі паі па 5—10—15 рублёў. Стаж знаходжання іх у кааператыве вылічаецца, у лепшым выпадку, некалькімі месяцамі.

Такім чынам, праведзена спроба адняць кватэры ў старых пайшчыкаў, выканаўчых свае абавязацельствы перад кааператывам, упёсных поўнасцю свае паі, і перадаць іх тым, хто ў часе законнага размеркавання кватэр нават не з'яўляўся пайшчыкам дадзага кааператыва. Гэтымі дзямі тав. Раманкевіч ужо самавольна засаліў дзве кватэры.

Мы лічым, што дзеянні прадстаўніка даржылсаюза МБВ чыгунні тав. Калініна і старшыні праўлення ЖБКТ тав. Раманкевіча з'яўляюцца грубейшым парушэннем рэвалюцыйнай законнасці. Мы не бачым ніякай падставы да пазбаўлення нас зусім законна атрыманых палі кватэр.

Пастаўце выкладзенага просім дабіцца скасавання незаконных распараджэнняў т. т. Калініна і Раманкевіча і прыняць меры да канчатковага вырашэння пытання аб усяленні старых пайшчыкаў у другі корпус.

УСЕБЕЛАРУСКІ ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЕЛАГАДОЎЛЮ

Саўгасы, пакажыце ўзоры добрай падрыхтоўкі жывёлы да зімоўкі

САУГАС УВАРАВІЧЫ СТАНОВІЦЦА УЗОРНАЙ ГАСПАДАРКАЙ

У залітым электрычнасцю клубе саўгаса **ЎВАРАВІЧЫ** сабралася сёння шмат народа. Тут і вясёлая саўгасная моладзь, тут і немала старых, былых парабкоў пана Ліпніцкага, якія яшчэ добра памятаюць дні жабрацкай нядолі ў панскім маёнтку і ўрадніцкі бізун.

На праверцы радоў сваёй партыйнай ячэйкі, яны падагульваюць сёння вынікі пройдзенага сельска - гаспадарчага года.

Не ў прыклад ранейшым гадам, сёлета вясна ў саўгас прышла тады, калі зямля яшчэ тулілася ў снежнай коўдры. У гэтыя дні вясну гукалі ў трактарнай майстэрні, ля рамонтных варштатаў і на гаспадарчым дворе.

— На гэтай разваліне нікуды не палезеш, — крычалі ўсе трактарысту **КРЫНІЦЫ ФРАНЦУ, калі ён падышоў да старога, абшарпанага «Фардзона-путілаўца».**

З таго часу, як Крыніца сябе памятае, ён працуе ў саўгасах. На трактар Франц упяршыню сеў у 1923 годзе. І з той пары з трактара не злазіў. Не было такога выпадка, каб Франц спасаваў перад якой-небудзь перашкодай.

— Няўжо-ж прыдзецца адмовіцца ад гэтага «Фардзона»?

Доўга і ўважліва вывучаў Франц даручаны яму трактар. Разабраў яго на костачках, шрубачках, агледзеў, падрамантаваў і пашоў у поле.

Франц са сваім «Фардзонам» заняў першае ганаровае месца ў саўгасе. 13 тектараў у дзень узорнае ён на сваім трактары. Дасюль яшчэ ніхто столькі не заворваў.

І не толькі трактар вырашыў перамогу. Для 700 га трох трактараў мала. Кінулі ўсю цягавую сілу. І тут сапраўд ныя ўзоры барацьбы за ўраджай паказаў пазвы рабочы **ПАНЦЯЛЕЕНКА РЫГОР**, які замест 0,75 га ўзорваў штодзень на пары 1,3 га. Не адставалі і Шымянскі Піліп, Кавалёў Ігнат, Шэўчэнка Алёна і інш.

— Не лёгка далася нам ранняя сяўба, — успамінае саўгасны партыйны сакратар. — Мы вясну гукаем, а некаторыя апартуністы, як Нікаланенка і іншыя, давай падбухторваць рабочых:

— **СКРОБ** (дырэктар) шкодніцтвам займецца, насенне ў грэх кідае. Пад суд яго.

Перадавікі на чале з партыйнай ячэйкай ужылі дырэктара пад сваю абарону.

— Не можа таго больш быць, каб зноў, як летась, прынесці дзяржаве 70.000 руб. спрат. Гэты год павінен быць пераломным. Не спраты, а прыбытак даваць дзяржаве.

— Да 25 красавіка скончылі сяўбу аўса, а да 10 мая—ўсе асталіяя культуры. Сеялі радковымі сеялкамі. Насенне сартавалі, пратручвалі. На палі вывезлі 800 цэнтн. мінеральных угнаенняў і 3.400 тон навозу.

Зямля не паскупілася. Кожны гектар звышпланавай сяўбы аўса даў 120 пудоў. Жыта ўзяло 60 пудоў з га, азімай пшаніцы — 81 пуд, ячменю — 100 пудоў.

Вось і вынікі. Яны гаспадарку і дзяржабезпечнасці прывялі. Летась цэнтнер жыта каштаваў сабе 31 руб., а сёлета — 6 руб. 90 к. Цэнтнер аўса абыйшоўся: 40 руб. і 7 руб. 40 к. Лічбы самі за сябе гавораць.

Саўгас дагэрмінова поўнасцю выканаў свае абавязкі перад дзяржавай, здаў 6.600 пудоў высокаякаснага жыта, 720 пудоў пшаніцы, 1.500 пудоў яблык, 1.200 пудоў гуркоў, 1.200 пудоў бульбы. Да 15 верасня скончана ўсяя сяўба. Свалчасова праведзена сафаліва.

Але асноўнае ў саўгасе — малочны цэх — тыя 514 штук жывёлы, якія вызначаюць напрамак гаспадаркі. Асноўнае — гэта выкананне плана здачы масла ад 254 малочных кароў і рост стада за кошт 160 штук маладняка і 45 нецелёў.

— Было-б карысна ўсім нам цяпер адразу са схода пайсці ў кароўнікі, туды, дзе электрычнае асвятленне ператварае ноч у дзень, — гаворыць з месца дырэктар Скроб.

— Малако ў каровы на языку, — каска прыказка. Як будзеш карову карміць, так яна і аддакуе табе. Замест леташніх 1.200 мы сёлета апрымалі ў сярэднім 1.400 літраў на карову. Кожная даярка пераканалася, што ўлёгіваць каровы і яе ўласны заработак залежаць ад таго, як жывёла будзе даглядзана. Першай паказала прыклад **ХАРЫТОНЕНКА ДУНЯ.** Гэта яна першай пачала добра вычышчаць станок, мякка падсцілаць, добра карміць, поўнасцю выдойваць. А ў канцы месяца — глянь, і заработак яе падскочыў на 20—25 руб. вышэй, чым у іншых даярак.

Зімой у нас каровы ў цялле і сытымі будуць. Кармоў хапае. Сена ўсё падвезена, бралі з бровару ёсць удосталь.

Зараз нам самае галоўнае падрыхтаваць цялятнік. Мы тут плануем так, каб забяспечыць толькі што народжаных цялят сапраўды цёплым, адпавядаючым усім правілам гігіены цялятнікам.

Ужо нашы рабочыя паказуць, што з новага прыплода ні адно цялё не загіне. Што гэтай зімой каровы дадуць столькі малака, як ніколі.

Даклад сакратара ячэйкі быў-бы непоўным, калі-б не далець аб тым, якія ўмовы стварыла дырэкцыя саўгаса для рабочых.

Для лепшых ударнікаў адрамантавае другі паверх вялікага дома. Кватэры добра абсталяваны. Кожнаму рабочаму да хаты прывезлі дровы. У хатах чыста і цёпла.

Пры сталовай саўгаса — свінаферма, дзе ўтрымліваецца 116 галоў выключна для работага забеспячэння. Раней гэта не было ў сталовай такога дня, каб адзін або два разы не падавалі мяса. Недарма за ўвесь год не кінуў работы ў саўгасе ні адзін рабочы.

Л. КАПЛАН.

КАМБІНАТ № 1

На левым беразе Дняпра, сярод невялікага хваёвага лесу размясціўся свінасаўгас **Бабінічы.** Некалі тут панаваў праслынуўшы сваёй нялюдскай эксплаатацыяй памешчык Рэнта. Больш паловы жыцця свайго аддала батрачка **Гарбаценка Хеўронія** на памешчыка Рэнта і яго папяродніка барона Корфа.

Цяпер Гарбаценка Хеўронія ўжо не батрачка. Камбінат № 1, дзе Гарбаценка з'яўляецца старшай свінаркай, праславіўся як найлепшы камбінат ва ўсім свінагадоўчым цоху.

Роўна а 4-ай гадзіне раніцы вы ўжо можаце спаткаць Гарбаценка на свінарніку. У яе разнародзныя, як старшай свінаркі, ёсць тры памочніцы. Аднак, першы агляд пагалоўя яна чэкому не давярае.

—Раннім агляд свіней трэба пра весці з асаблівай увагай—расказвае нам аб сваёй бягучай рабоце Хеўронія. Ці мала што за ноч магло зда рыцца. Вартаўнікі ў нас людзі надзей ныя, але ўсё-ж не шкодзіць яшчэ раз праверыць ці не захварэла якое парася, ці не прыдушыла матка свайго сысуна.

Праз поўгадзіны пачнуць свінкі перны корм. Работа адказная, і Гарбаценка Хеўронія дае сваім памочніцам вызначныя ўстаноўкі:

— У станках свіней не карміць, абавязкова у сталоўны свінарнікаў. Больш слабых парасят карміць з асобнага карыта, каб яны галоднымі не засталіся. Сачыць за тым, каб да карыта больш 10 парасят не падпускаць, бо іншы адно парася з'ясць больш, чым яму трэба і залаўрее, а другое недаесць.

І яе памочніцы—**Цітова, Лагунова і Якаўлева**—са ўсёй дакладнасцю ды конваюць яе распарадженні.

Хеўронія добра разбіраецца ў кармленні і наогул у доглядзе свіней. Яна сістэматычна навяжае арганізаваныя пры саўгасе курсы зоа-і ветэрынарнай тэхнікі. Шматгадовая практычная работа таксама шмат чаму яе навучыла.

Часта ў часе нарыхтоўкі ды можаце бачыць як Гарбаценка прыпае на руках парася, ужае яму лыжкай у рот кофе па малаку, сюіпаю—матку корміць пасмажаным абсом. Гэта значыць, што ў парасяці паносы.

У такім самым строгім парадку пра ка статкоў, вадапой, прагулка, пояцыя і г. д. І ўсё гэта абавязкова пры ўдзеле Гарбаценка, пад яе асабістым нагляцам.

Як закон, пасля ўзважвання свіного стада—штодзённыя выторгуны на рацы свінарак, свінароў і падсобных рабочых свінагадоўчага цоха.

— Чаму ў свіней, да якіх пры мацавана свінарка Якаўлеса, малая сярэдня-сутачная прывага? Не 600 грам, як гэта прадугледжана планам, а 450 грам?

Чым свінарка Цітова дабілася, што яе свінкі маюць натроблую, а часам і большую прывагу, чым прадугледжана планам—800 і больш грамаў?

Хто вінаваты ў тым, што сёння трава была пасена несвячасова і ў невыстарчальнай колькасці?

Вось такога рода пытанні штодзённа разглядаюцца на вытворчай нарадзе, тут-жа прыкладна разбіраюцца ўсялякія непаладкі ў доглядзе свіней, у палажэнні іх стаўлення. На нарадзе прысутчаюць зоатэхнікі, ветарыцарны доктар і тэхнік-свінавод.

Ударная работа Гарбаценкі дае блізкучыя вынікі. Сярэдні выхад парасят на матку ад аходзе па камбінату № 1 складае 9 штук (пасцлам па дугледжана 8 штук). Калі па ўсяму камбінату сярэднястатычная прывага свіней складае ад 180 да 300 грам, то па першаму камбінату яна дасягае 700-800 грам. У верасні і кастрычніку гібель маладняка па другім камбінатах складала 12 проц., а па камбінату Гарбаценкі—толькі 4 проц.

Аб сабе асабіста, аб сваім жыцці і сапраўдзе Гарбаценка расказвае вось што.

— Я і мая сям'я сыты, адзеты і абуты. За добраякасную здачу мяса, апарос і ацлучку я, як і ўсе свінарні маёй брыгады, атрымліваю поўную ўзнагароду. У выніку мой месячны заработак замест 82 р. 50 кап. дасягае 180-194 рублёў. За выкананне колькасных і якасных паказальнікаў плана мясапачы я ўжо некалькі разоў прэміравалася. Як лепшая ударніца я прысцаравана за ўдарнага стала — атрымліваю штодзённа мясныя абеды.

Так жыве і працуе былая [illegible] ка, цяпер ударніца саўгаса Хеўронія.

УСЕБЕЛАРУСКІ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ тав. ГІКАЛО

ПАРТЫЙНЫЯ І ПРАФСАЮЗНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, З ПЕРШЫХ-ЖА ДЗЕН ПАХОДА УЗНАЧАЛЬЦЕ НОВУЮ ХВАЛЮ СПАБОРНІЦТВА МАС

АДОЗВА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЕТА УДАРНІКАЎ ЯКАСЦІ І АУЛАДАННЯ ТЭХНІКАЙ

ДА УСІХ УДАРНІКАЎ, УДАРНІЦ, ДА УСІХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ, ІНЖЫНЕРАЎ І ТЭХНІКАЎ БССР

ТАВАРЫШЫ!

Мы, ударнікі якасці і асваення тэхнікі, сабраўшыся напярэдадні XVI гадавіны Кастрычніка на свой першы ўсебеларускі злёт для абмена вопытам і абмеркавання пытанняў, звязаных з пасяховым завяршэннем прамфінплана першага года другой пяцігодкі, адзначаем вялізарнейшыя поспехі нашай краіны, дасягнутыя пад кіраўніцтвам ленінскай партыі і нашага любімейшага правадыра т. СТАЛІНА.

Аціраючыся на пройдзены 16-гадовы шлях барацьбы і перамог, мы не можам не адзначыць і тых вялізарнейшых дасягненняў нашай Совецкай Беларусі, узрастаючай разам з усім Совецкім саюзам.

Совецкая Беларусь, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, пры брацкай дапамозе пролетарыяў Совецкага саюза, ажыццяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, ператварылася ў магутную соцыялістычную рэспубліку з высока-развітай соцыялістычнай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

Гераічны рабочы клас і кіруемае ім селянства забяспечылі выключныя поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў галіне народнай гаспадаркі, культуры ў Совецкай Беларусі.

Амаль пакала набудавана прамысловасць БССР. Дзесяткі новых буйнейшых прадпрыемстваў пушчаны ў ход (бабруйскі лесахімкомбінат, Гомсельмаш, БелДРЭС імя Сталіна, «Сцяг індустрыялізацыі», «КіМ», магілёўская шаўковая фабрыка і інш.).

XVI гадавіну Кастрычніцкай рэволюцыі БССР адзначае новымі перамогамі — пускам крычаўскага цэментнага завода і механізаванага шляхнога гіганта ў Касцюковічах.

Ажыццяўляючы пастановы студзеньскага пленума ЦК і ЦКК УсесКП(б), лістападскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б і указанні т. СТАЛІНА, рабочы клас БССР змагаецца за асваенне новай тэхнікі, за высокую якасць прадукцыі. Рад прадпрыемстваў БССР — магілёўская шаўковая фабрыка, гарбарня імя Сталіна, завод «Пролетарый» (Гомель), завод імя Ленінскага, гарбарня «Большэвік», завод імя Варашылава, «Ударнік», ф-ка «Кастрычнік», ф-ка «Профінтэрн», Палесдрук, фанерны завод «Энергія» (Віцебск), акулярная, папяровая фабрыка «Спартак», «Комінтэрн» (Барысаў) — поўнасцю выканалі 10-месячны прамфінплан, паказваюць значныя поспехі ў павышэнні прадукцыйнасці працы і зніжэнні сабекошту прадукцыі.

Адзначаючы гэтыя поспехі соцыялістычнай будоўлі, мы, ударнікі якасці, не можам прайсці міма таго факта, што за 9 месяцаў прамысловасць Беларусі не выканала свайго задання па копыкасных і асабліва па якасных паказальніках. Адна лёгкая прамысловасць БССР недадала дзяржаве прадукцыі за 9 месяцаў больш чым на 30 мільёнаў рублёў. Не выкананы таксама заданні па зніжэнню сабекошту. Наша лёгкая прамысловасць замест таго, каб даць зніжэнне сабекошту прадукцыі на 5 мільёнаў рублёў, дала павышэнне на 5 мільёнаў рублёў 800 тыс. рублёў.

ПЛАН ЗА УСІХ ПРАЦУЮЩЫХ У НАС НАСТУПНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ: абутковая фабрыка «Праца» (Гомель) 9-месячны прамфінплан выканала на 80 проц.; фабрыка імя Лекерта (Віцебск) выканала свой 9-месячны план на 77 проц.; абутковая фабрыка імя Кагановіча (Менск) выканала 9-месячны план на 88 проц.; фабрыка «КіМ» (Віцебск) выканала 9-месячны план на 73 проц.; бабруйскі лесахімкомбінат выканаў 9-месячны план на 93 проц., павялічыў сабекошт у першым паўгодзі на 14,5 проц., або на 1.207 тыс. рублёў. Асабліва дрэнна працуе прамысловасць, выканаўшая гадавы план за 9 месяцаў усяго на 55,7 проц.

ЧАМУ НАША ПРАМЫСЛОВАСЦЬ НЕ ВЫКОНВАЕ СВОЙ ПРАМФІНПЛАН? Чаму нашы добра абсталяваныя прадпрыемствы не выконваюць сваіх вытворчых заданняў і выпускаюць недаброякасную прадукцыю?

Гэтыя прычыны заключаюцца ў нас самых, у тым разгільдзяйстве, безадказнасці, расхлябанасці, якія вельмі часта праяўляюцца на нашых прадпрыемствах. Яны заключаюцца ў тым, што на нашых прадпрыемствах няма яшчэ цвёрдага арэшчанчалля, не пакончана з абязлічкай, з капіталістычна-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва, начынаючы ад наркаматаў, ад аб'яднанняў і канчаючы фабрыкамі і заводамі. Дрэнна ў нас з планаваннем, асабліва з унутрызаводскім планаваннем, няма ў нас яшчэ беражнага адносін да матэрыялу, да інструмента, да машыны.

Ад імя лепшых ударнікаў якасці Беларусі мы пытаем усіх таварышоў, ці можам мы ў далейшым цярпець такое становішча? Хіба не ў нашых сілах поўнасцю выканаць прамфінплан? Ці можа наша дзяржава і наша партыя мірыцца з такім ганебным адставаннем? НІЯК НЕ МОЖАМ.

Ложным палажэннем і дотэзам нашых вялізарнейшых, далёка яшчэ несфармуляваных мачымасцей, з'яўляецца работа нашых перадавых прадпрыемстваў, якія прышлі да XVI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі з выкананнем усіх сваіх заданняў. І нават у тых прадпрыемствах, дзе прамфінплан сістэматычна не выконваецца, паасобныя брыгады і нават цэхі ўвесь час выконваюць свае заданні.

Узоры сапраўды большэвіцкай барацьбы за высокія тэмпы социялістычнага будаўніцтва паказваюць **ударнікі высокай якасці магілёўскай шаўковай фабрыкі СЕМЧАНКА, СІДАРЭНКА, ЦЫБУЛЬКА, КЛІМКОВІЧ, ЦЕЛЯШЭУСКАЯ; ударная брыгада Ізотаўцаў тав. ЛАНЕЎСКАГА** на заводзе імя Варашылава; ударнікі другога хрома-вага цэха гарбарні «Большэвік» т. т. **БЕНГЕС, ШАМЕС, ЛЕВІН.** Ударная брыгада **БЕРНГОЛЬД** на заводзе «КОМУНАР». Ударная брыгада т. **КЛІМКОВА** на заводзе імя Ланцуцкага. Лепшая брыгада ліцейшчыкаў **ВАСІЛЬЕВА** на заводзе «Пролетарый» (Гомель). Брыгада **КОЦІКА** фанернага завода № 6. **НАДЗЯ АСТАШКО**, узнагароджаная ордэнам Леніна на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». Машыніст Менскага дэпо, узнагароджаны ордэнам Леніна т. **ДОСІН** і рад іншых рабочых, майстроў, інжынерна-тэхнічных работнікаў на ўсіх прадпрыемствах Беларусі.

Мы заявялі самы кароткі ў свеце рабочы дзень. Але мы яшчэ не навучыліся берагчы і карысней скарыстоўваць кожную мінуту рабочага часу, кожны абарот нашых варштатаў. На многіх прадпрыемствах рабочы дзень карысна загружан не больш 4-5 гадзін. Дрэсцінкі мільёнаў рублёў з'эканомілі-б мы, калі-б поўнасцю ўпічыльнілі рабочы дзень, калі-б правільна арганізавалі вытворчасць.

Да гэтага часу на нашых прадпрыемствах не наладжана выразнае кіраўніцтва, соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Нашы фабзавкомы часта не ведаюць сваіх ударнікаў, не вядуць сярод іх пякай масавай работы, не змагаюцца з лжэ-ўдарнікамі, рвачамі, лодырамі і бракаробамі.

Зніжэнне гэтых прычын залежыць ад нас саміх. У нашых руках магчымасць поўнага выканання прамфінплана. У нашых руках даць Совецкай краіне высокаякасную прадукцыю. Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мы можам і павінны ўстанавіць не папяровую, а сапраўдную адказнасць кожнага за дагучаную яму справу, за варштат, за брыгаду, за цэх, за фабрыку.

Вітаючы ініцыятыву менскіх ударнікаў, **абвясціўшых масавы вытворчы паход імя ГІКАЛО**, накіраваны на пасяховае завяршэнне першага года другой пяцігодкі, мы, дэлегаты ўсебеларускага злёта ўдарнікаў якасці, як адрэн чалавек уключаемся ў гэты паход і бяром на сябе наступныя абавязальніцтвы:

1. **Мабілізаваць усю сваю актыўнасць**, усю творчую энергію не толькі на выкананне плана чацвертага квартала, але і на папярэдзіць нашай запазычанасці краіне.

2. Каб выканаць гэта абавязальніцтва, **мы патрабуем ад дырэктараў прадпрыемстваў, ад інжынерна-тэхнічных работнікаў, ад нашых фабрычна-заводскіх камітэтаў такой арганізацыі працы на прадпрыемствах, каб ні адной мінуты не траціўся марна.** Самы кароткі ў свеце рабочы дзень павінен быць самым прадукцыйным. **Будзем прадукцыйна працаваць 420 мінут у дзень!**

3. **Мы абавязваемся вышэй падняць сцяг барацьбы за высокую якасць прадукцыі нашых прадпрыемстваў.** На кожным прадпрыемстве, у кожным цэху барацьбу з бракам зробім пярэйшай справай усёй рабочай грамадскасці. Маладому малавопытнаму рабочаму павінны дапамагчы старыя кваліфікаваныя рабочыя і работніцы, узяць над ім шэфства, перадаць свой вопыт, свае веды.

4. **Таварышы рабочыя і работніцы, таварышы ўдарнікі і ўдарніцы! Абвесцім бязлітасную барацьбу бракаробам, лодырам, рвачам. Злоснаму бракаробу няма месца ў рабочай сям'і. Кожны рабочы павінен ганарыцца прадукцыяй свайго прадпрыемства.**

5. **«Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё». «Самае важнае з пункту гледжання будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не можам і марыць» (СТАЛІН).**

ТАВАРЫШЫ СПЕЦЫЯЛІСТЫ! ТАВАРЫШЫ ІНЖЫНЕРЫ І ТЭХНІЧНЫЯ РАБОТНІКІ!

Вышэй сцяг барацьбы за аўладанне тэхнікай, за асваенне новага абсталявання! Кожны спецыяліст павінен стаць актыўным арганізатарам асваення новай тэхнікі, новага абсталявання. **Узмацнім вытворча-тэхнічны інструктаж ля рабочага месца.** Забяспечым бесперабойную работу тэхнічных гурткоў, курсаў тэхвучобы, даб'ёмся таго, каб кожны наш рабочы быў узброєн самымі неабходнымі тэхнічнымі ведамі.

6. І да вас наша слова, таварышы рабочая моладзь. Барацьба за аўладанне тэхнікай, за здачу нормы па тэхнічнаму мінімуму павінна стаць штодзённай барацьбой усёй нашай рабочай моладзі, накіраванай на выкананне прамфінплана, на барацьбу з паломкамі абсталявання, аварыямі, на барацьбу за павышэнне якасці прадукцыі.

7. Асобны рахунак у нас **да вас, таварышы рабочыя-чыгуначнікі.** Дрэнная ваша работа ставіць пад пагрозу і нашу барацьбу за пасяховае выкананне прамфінплана першага года другой пяцігодкі. Ад вашай работы залежыць наш поспех. **Мы звяртаемся да рабочых і ІТР МБВ і Заходняй чыгунак — забяспечыць бесперабойнае абслугоўванне нашай прамысловасці, роўнамерна падаваць грузы, забяспечыць вываз гатовай прадукцыі. ТРАНСПАРТ ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ, ЯК МЕХАНІЗМ ГАДЗІННІКА.**

8. **ТАВАРЫШЫ КАЛГАСНІКІ І КАЛГАСНІЦЫ!** Вы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі дабіліся выключных поспехаў у справе ўмацавання калгаснага лада. Калгаснае селянства БССР узбучена ідзе да культурнага заможнага жыцця. Вы на практыцы гэтага года пераканаліся, што азначае сумленная ўдарная праца, якая забяспечвае ўдзым дабрабыта калгаснікаў.

«Каб стаць калгаснікам заможнымі, — вучыць наш правадыр тав. СТАЛІН, — для гэтага патрэбуецца толькі адно — працаваць у калгасе сумленна, правільна скарыстаць трактары і машыны, працаваць усяго на 65,7 проц. Усяго за 9 месяцаў план па шырпатрэбу выканан на 72,4 проц. і за верасень на 57,1 проц., у той час, калі нават мясцовая прамысловасць РВК і гарсоветаў па жыццёваму плану выканала па 77,2 проц. за 9 месяцаў і на 73 проц. за верасень.

Наркамцяжпрам металаапрацоўчай прамысловасцю па сутнасці не кіруе. У вытворчым сектары ўся металаапрацоўчая група прадстаўлена эканамістам дрэваапрацоўчыкам т. КОГАНАМ, які зусім не здолеў кіраваць гэтым участкам. Асабліва нездавальняюча пастаўлена работа па тэхнічна-планавасму кіраўніцтву шырпасажнікам. Зусім не вядзецца работы на вывучэнню запатрабаванняў шырокіх мас, на палепшэнню якасці прадукцыі, выпучэнню асортымента, спецыяльнасці заводаў. Зусім няма сувязі з таварапрадаючай сеткай. Заводы ў гэтых паўгадах поўнасцю прадастаўлены самі сабе.

У выніку гэтай бескантрольнасці, безадказнасці кіраваць па-сапраўднаму, рад важнейшых заданняў урада і партыі былі сарваны (выпуск запасных частак для трактараў, торфакамбайнаў і рад іншых).

У галіне будаўнічых матэрыялаў, не гледзячы на рад пастаноў урада і партыі, становішча з выкананнем плана на зусім нездавальняючае. Выкананне плана ідзе ніжэй 1932 г., не гледзячы на правядзенне ў 1931 і 1932 г. г. знач нага будаўніцтва і пуск новых заводаў, якія ўвайшлі ў эксплаатацыю ў 1932 і 1933 г. За 9 месяцаў 1933 г. выпуск прадукцыі па будматэрыялах склаў 1.652,7 т. р. супроц 1773,6 у 1932 г.

Не гледзячы на пастанову СНК СССР аб арганізацыі ўсёй работы па будматэрыялах, аб выяўленні патрэбы ў іх на БССР, аб планаванні вытворчасці і прымяненні рэканструкцыі [illegible] справу, Наркамцяжпрам Б/ компарэ ў гэтым напрамку не пра[illegible] заключэння зусім нездавальняюча. 1918 годзе. завод, штучных сушкі [illegible] лікімі порабкамі і яшчэ лозунгамі ба не асвоены. Рад заводаў, барацьбы сусіх укладзены [illegible] ратаванне Торгце даюць нікага эфе[illegible]

нашы завод, фібралітавы завод, завод буйна-блочных камянёў, чарапічны завод і т. д.), але Наркамцяжпрам лічыць гэта звычайным.

Па раду заводаў няма матэрыялаў тэхнічна-эканамічнага абгрунтавання і ў асабліваці матэрыялаў аб сыравой базе. Так, на працуюць з-за адсутнасці сыравой базы пакінабудаваныя заводы: Віцебскі шаўковы завод, асобныя цагельні і чарапічныя заводы. Есць рэальная пагроза спынення работы рада аснатых заводаў з-за адсутнасці вычэрпанай сыравой базы.

Не гледзячы на неадпаравасныя сігналы як центральнага друку (газ. «Экономическая жизнь» № 74 за 1932 г.), так і мясцовых арганізацый, ігнаравалася [illegible] НКПП СССР т. Амбражунас не арганізавала работы на гэтым участку, не шукаў рашучых мер па сістэматызацыі матэрыялаў Белгоразведкі, а працяўў у гэтай справе бюракратычную цягаціну.

Таксама не праявіла ініцыятывы ў гэтым пытанні і ячэйка КП(б)Б Наркамцяжпрама, дапусціла выключную цягаціну ў справе разгляда матэрыяла. Камісія ячэйкі пасля доўгага часу расследавання справы нічога не зрабіла і ў выніку гарКК КП(б)Б абвясціла вымову бюро ячэйкі. Адпак, справа і да гэтага часу не вырашана. Разам з гэтым Наркамцяжпрам зусім не рэагаваў на прарывы ў рабоце.

Ліпеньскі пленум абавязаў Наркамцяжпрам арганізаваць сваячасовы нагляд, выразную пастаноўку ўліку і аналіз выканання плана, асабліва па якасных паказальніках. Адпак, гэтага Наркамцяжпрам не робіць. Справаздачна-эканамічны сектар з начальнікам яго т. Ярмолавай абмяжоўваецца складаннем таб[illegible] выканання плана, але нікай кан'[illegible]

Прысут[illegible] работы не праводзіць. Сек[illegible] ніных з праф[illegible] ські адвакат Дзечу[illegible] талічныя матэрыялы з сацыялістычнай [illegible] ны з сацыялістычнай [illegible] у Амстэрдамскім [illegible] ным канграсе — Пуці і Ва[illegible]

(Б[illegible]

ЯК ТРЭБА ЗМАГАЦЦА З БРАКАМ

На ўнутрызаводскім конкурсе брыгад строгалі 2-га хромавага цэха атрымалі пераходны сцяг. Годнасць лепшай брыгады зваявана ўпартай барацьбой за рэалізацыю рашэнняў партканферэнцыі па якасці, за поўнае ўпчыльненне 7-гадзіннага рабочага дня, за добрую пастаноўку партыйна-масавай работы ў брыгадзе. Барацьба з бракам і за высокую якасць прадукцыі — цэнтры ўвагі работы брыгады. Бракёр выкрывае брак, будзь то трэк, дзіра, капт ці парубка. Ён адразу-ж падносіць і паказвае таму строгалю, які зрабіў брак. Калі строгаль не згодзен і адмаўляецца ад бракі, гэта скура адкладваецца і ў перапынку ўся брыгада вырашае спрэчнае пытанне. Брак вывешваецца ў вітрыне брака, апісваецца ў насценгазеце і т. д. Калі ў кагосьці перарасход балаў, то з яго робіць адпаведныя вылічэнні. Брыгада разглядае пытанне не толькі аб браку, але і аб неўважлівых адносінах да работы. Напрыклад, строгаль Шапіра пачаўся за кольскасцю і ў выніку гэтага прыйшоўся адкінуць яму каля 50 проц. скуры для перапрацоўкі. Бы ла склікана брыгада, якая абгаварыла гэта пытанне і дала яму вымову з пазіраваннем. Пасля гэтага больш такіх выпадкаў не паўтараецца. У брыгадзе працуе грамадскі бракёр, які часта правярае работу кожнага рабочага. Мы практыкуем ударны дзень якасці і выніхі спаборніцтва вывешваем на дошку. Вось лепшыя ўдарнікі, даўшыя за 9 месяцаў проц. брака ніжэй дазволенага: Левін—20 проц., Бенгіс—23 проц. Дзякуючы большэвіцкай мабілізацыі брыгады ва кол пытання аб якасці, мы маем эканомію за 8 месяцаў 2.930 рубл., з якіх па сабекошту—1.314 рубл., па якасці 1.616 рубл. Прамфінплан за трэці квартал выкананы на 129,8 проц. Брыгада першая па Беларусі ўключылася ў паход за поўнае ўпчыльненне 7-гадзіннага рабочага дня. Барацьбу за ўпчыльненне рабочага дня мы пачалі з расстаноўкі рабочай сілы. Шмат часу рэдкай рабочыя брыгады трацілі на падноску сыравіны, цяпер сыравіну падносяць спецыяльныя рабочыя. Частая спынка рэмняў выклікала кожны дзень мінімальна 1-2 гадзіны прастояў. Зараз арганізован кантроль над спынкамі рэмняў. Норма выпрацоўкі дзякуючы гэтаму ўзнялася з 90 скур да 110. Парторг Заміньскі за добрую пастаноўку работы партгрупы прамінан гарадской канферэнцыяй партгрупы экскурсіяй у пролетарскія цэнтры. Мы атрымалі пераходны сцяг цэха. Перад намі ў 4-м квартале стаіць задача: яшчэ больш палепшыць сваю работу. Вытворчы паход імя Гікало, у ліку ініцыятараў якога з'яўляемся і мы, каслужыў магутным багаром уздыму нашай работы.

Мінск.

Цагельнікі могуць і павінны выканаць план

Адной з лепшых цагельняў рэспублікі з'яўляецца цагельня № 8 трэста «Белбудматэрыялы» — у Лошыцы Кемаршанскай.

Гэта цагельня можа сёння рапартаваць партыі і ўраду аб сваіх вялікіх вытворчых перамогах.

Цагельня выпрацоўвае цэглу ручной і машынай фармоўкай. План на 1933 год па сыраму — 5.120 тыс. штук, па апалу — 4.300 тыс. штук. На 1 лістапада выканана па сыраму — 4.553.966 шт., што складае 88 проц., а па апалу — 3.497.238 шт. — 113 проц.

У чым крыецца прычына недавыканання плана па сыраму?

Невыстарчальная падрыхтоўка да сезона як у адносінах проса, так і ў абслугоўванні сезонікаў. Не былі своячасова прыведзены ў належны выгляд сталоўка і інтэрнат. Адміністрацыйна-тэхнічныя работнікі цагельні не здолелі правільна расставіць рабсілу, даць належны ход просам, папяродзіць паломкі, загатовіць запасныя часткі і т. д.

Цагельня, улічыўшы гэты промах мінулага года, ужо вядзе ўзмоцненую падрыхтоўку да будучага сезона. Падрыхтоўваючыся да летняга сезона, арганізацыі разгарнулі канкрэтную падрыхтоўку і да зімовага перыяду, падхапілі сталінскі паход. З брыгады па трох маршрутах правялі праверку стана заводскіх жыллёвых памяшканняў, даро, дапаможных і вытворчых будынкаў. Ужо прыступілі да рамонта раду будынкаў.

Пабудаваны капуста-хавальні, зроблены 6 чанаў умяшчальнасцю па 2½ кбм. кожны, завозяцца на завод дровы для рабочых, ідзе ачыстка труб, жыллёвага пасёлка і заводскай тэрыторыі, умацаванне мастоў і г. д.

Бесперапынна ідзе работа па загрузцы ў гофманскай печы, па пасадзе цэглы ў камеры, па апалу і выпрацоўцы гатовай прадукцыі.

Тут — у цэху печы — рабочыя паказалі балыпыя тэмпы работы. Яны ўзяліся з 15 кастрычніка да 1 лістапада загрузіць, зрабіць садку, абпаліць і выпрацоўць 300.000 штук цэглы. З 1 лістапада да сёння — знаць гатовай прадукцыі 150 тыс. штук. Работа закіпела. Ні адной мінуты прастоя. У выніку план на 1 лістапада перавыканан. Замест 300 тыс. штук дана 347 тыс. штук, што складае 115,7 проц.

Безумоўна, узятае абавязацельства — 150 тыс. штук цэглы, таксама будзе перавыканана.

Норма загрузкі адным чалавекам у васьмігадзінны рабочы дзень складае 3.500 штук (пры адлегласці 75 м. ад печы), а загружаецца 3.610 штук цэглы ў дзень; норма выгрузкі — 4.500 штук, а выгружаецца па 6.600 штук штодзённа.

На заводзе ёсць 43 праверанных сапраўдных ударнікаў.

Цагельня ганарыцца за гэту сям'ю 43 чалавек, моцных, старанных, адданых рабочых.

Асабліва выдзяляюцца: **Маліноўскі** (стары рабочы 73 год), з малых год працуючы на цагельнях малады рабочы тав. **Цыркун** — кваліфікаваны садчык, умелы арганізатар брыгады; маладыя фармоўшчыцы т. т. **Асадоўская і Дударчык**, якія пастаянна перавыконваюць нормы.

Рабочыя цагельні па сваёй ініцыятыве арганізавалі 30 кастрычніка ўдарны суботнік.

З сялянім энтузіязмам і ахвотай, в выключнай энергіяй працаваў увесь калектыў цагельні № 8 у гэты балявы дзень па гаюўцы цэглы.

Якасць прадукцыі — цэнтральнае звяно работы цагельні. Паводле даных аноймнага круга апала процант брака абпаленай цэглы складае 0,5 проц. супроць 2 проц., дапушчаных па норме. Аналізы, зробленыя ў лабараторыі цагельні № 8, паказалі высокі гатунак гэтай цэглы, які наближаецца да стандарта.

Значная ўвага адасецца апалу на цагельні № 8. Апал—галоўным чынам фрэзерны торф — захоўваецца тут пад навесаю, вядзецца штодзённы ўлік выдаткавання яго. Ні аднаго грама лішняга торфа, ні аднаго грама апала, страчанага даромна—такі лозунг палынічкаў цагельні № 8.

Абвешчаны ўсебеларускім злётам якасці масавы вытворчы паход імя т. Гікало ўзварушыў работы калектыў цагельнікаў, узняў энтузіязм на аўладанне тэхнікай.

Да гэтага часу сярод рабочых невыстарчальна праводзілася работа па тэхпрапагандзе. Зараз ІТР цагельні ўзяліся па-большэвіцку за гэту справу і арганізавалі два гурткі тэхмінімума.

Работа цагельні № 8 паказвае, што планы цагельнай прамысловасці могуць і павінны быць выкананы.

Інжынер Р. КАЦНЕЛЬСОН.

Першыя дні паходу

Закончыўся першы ўсебеларускі злёт ударнікаў якасці. Падрыхтоўка да злёта выклікала шырокую хвалю социялістычнага спаборніцтва за выкананне прамфінплану, за якасць прадукцыі. Многія прадпрыемствы, асобныя цэхі, ударнікі пакінулі большэвіцкія прыклады барацьбы за выкананне плана, павышэнне прадукцыйнасці працы, зніжэнне сабекошту і паляпшэнне выпушчаемай прадукцыі.

Зрух гэты трэба замацаваць. Усебеларускі злёт падтрымаў прапанову дэлегацыі заводаў «Комунар», імя Варашылава, «Большэвік» арганізаваць усебеларускі вытворчы паход імя тав. ГІКАЛО за пасяховае выкананне гадавога плана. Прапанова гэта падхоплена ўсімі дэлегатамі злёта.

Ужо на злёце былі заключаны першыя социялістычныя дагаворы.

* * *

★ Паміж дэлегатамі Менска, Гомеля і Віцебска заключан першы социялістычны дагавор. У аснову дагавора пакладзены наступныя абавязацельствы: выканаць гадавы план па ўсіх паказальніках, ахапіць 50 проц. рабочых тэхнічнай вучобай, ушчыльніць рабочы дзень і г. д. Дагавор падпісан менскай дэлегацыяй ад завода «БОЛЬШЭВІК», імя ВАРАШЫЛАВА, «КОМУНАР», шаўкавай «КАСТРЫЧНІК», шчацінной фабрыкі. Ад гомельскай дэлегацыі завод «ПРОЛЕТАРЫЙ», ГОМСЕЛЬМАШ, «КОМІНТЭРН», вагоннае дэпо. Ад віцебскай — «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» і інш.

★ Такі-ж дагавор заключан паміж дэлегатамі БАРЫСАВА, МАГІЛЕВА і БАБРУЙСКА. Сярод прынятых абавязацельстваў — нападзіць social-імпетычную праверку дагаворам па спаборніцтву.

★ Асобны дагавор заключан паміж шэфнымі прадпрыемствамі БССР. Ужо з 20 снежня пачынаецца праверка дагавораў. У спаборніцтве будзе ўдзельнічаць та кія шэфныя прадпрыемствы: «ПРАФІНТЭРН», «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», «КАСТРЫЧНІК», імя КРУПСКАЙ, імя ВАЛАДАРСКАГА, імя ДЗЯРЖЫНСКАГА і імя 8 САКАВІКА.

★ У вытворчы паход імя ГІКАЛО ўключыліся дэлегаты ад 16 прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці. Дрэваапрацоўшчыкі абавязаліся: выканаць гадавы план па копыкасных і якасных паказальніках, да 26 лістапада ліквідаць дэфіцытны ўлік брака, да 1-га снежня ахапіць вучобай не менш 25 проц. рабочых, 1-га студзеня правесці тэхэкзамен для 50 проц. рабочых, арганізаваць праверку абавязацельстваў у такія тэрміны: 20-га лістапада, 1-га і 15-га снежня і 1-га студзеня 1934 года. Віцебскі фанерны завод узяў на буксір адстаючы Бабруйскі фанерны завод № 16.

★ На другі дзень, пасля ўсебеларускага злёта па якасці — 6-га лістапада на шаўковай фабрыцы «КАСТРЫЧНІК» быў праведзен масавы вечар, прысвечаны ходу імя ГІКАЛО, на якім выступілі дэлегаты злёта ад фабрык «КАСТРЫЧНІК», «ПРАФІНТЭРН» і «СЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ». Паход імя ГІКАЛО пачаўся масавым святкаваннем.

ЗАКЛІНАННІ І АЛІЛУЙШЧЫНА ЗАМЕСТ БОЛЬШЭВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА

Ліпеньскі абʼяднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б прызнаў работу ўпаўнаважанага НКПП СССР зусім нездавальняючай. Кіраўніцтва не перабудавала работы ў адпаведнасці з пастановамі студзеньскага і верасеўскага пленумаў ЦК УсесКП(б), пленумаў ЦК КП(б)Б і пастаноў ЦК УсесКП(б) аб Данбасе.

Адпаведна ацэньваючы нецярпімы стан і кіраўніцтва прамысловасцю, пленум абавязаў т. Амбражунаса на працягу бліжэйшага часу ліквідаваць дапушчаныя прарывы ў прамысловасці і карэнным чынам перабудаваць работу.

Адпак, работа па цяжкай прамысловасці не толькі не палепшылася, а наадварот, ёсць рад момантаў, якія сігналізуюць аб сабатажы Наркамцяжпрамам пастаноў пленума ЦК КП(б)Б. Пленум абвінаваціў Наркамцяжпрам забяспечыць поўнае выкананне плана па торфадабычы. Гэтага не зроблена. План торфадабычы выкананн толькі на 68,6 проц.

Кіраўніцтва ўпаўнаркамцяжпрама спасылаецца на дрэнне падвор'е. Але ёсць такія заводы, якія абвінавачваюць гэтыя довады «Закрацінскі мох» — (Васілёўчы) — на 104,9 проц., Балбасава (Орша)—на 91 проц., «Давыдаўка» (Гомель)—на 80 проц. і інш.

Усё гэта сведчыць аб тым, што у торфпрамысловасці былі мячымасці выканаць план 1933 г., але косная і саюзна-панская адносіны да справы з боку Наркамцяжпрама і Белторфтрэста з'явіліся гэтаму перашкодай. Асноўны в сектарыі Наркамцяжпрама — вытворча-планавы — па сутнасці торфам не займаўся.

Тарфяной трупай у сектары кіраваў інж. Савіцкі, па спецыяльнасці хімікі-шматнік, які не раз заяўляў, што ён не забяспечвае работы на гэтым участку. Адпак, тав. Амбражунас лічыў гэта не такім важным пытаннем, у выніку чаго вытворча - планавага кіраўніцтва торфпрамысловасцю з боку Наркамцяжпрама зусім не было.

Характэрна, што калі правал работы на гэтым участку стаў зусім відавочным, толькі тады т. Амбражунас ва мяне інж. Савіцкага спецыяльстам тарфянікам, між тым сезон ужо скончыўся.

Такім чынам, работа па ажыццяўленні пастаноў ЦК КП(б)Б аб тарфяной прамысловасці праходзіла самацёкам.

Становішча пагоршылася яшчэ і таму, што работнікі Наркамцяжпрама былі зусім адарваны ад жыцця торфазаводаў, яўкой там не бывалі. Толькі ў канцы сезона былі пасланы на заводы асобныя работнікі, але і тут канкрэтных вынікі былі зусім нявялікія. Адпак справаздач і характарыстык аб стане «рабоце» на заводах гэтыя таварышы не забыліся ўзяць, улічваючы набліжэнне чысткі партячэйкі.

Замест канкрэтнай дапамогі выдавалися дэкларацыйныя загады, давалися ўсім тэлеграмы аб неабходнасці выканання прамфінплана. А ў гэты час на заводах было выключна дрэннае становішча з жыллёва-бытавымі ўмовамі, з санітарным станам, з ходам капітальнага будаўніцтва.

Ужо з пачатку сезона была тэнденцыя неканцінкі здабычы фрэзернага торфа, спасылаючыся на дрэннае падвор'е. Разам з тым з боку спажыўцоў апала мелёся выпадкі беспадстаўнага адмаўлення ад фрэзернага торфа, і на гэта Наркамцяжпрам не рэагаваў.

Не лепш справа стаіць і ў металаапрацоўчай прамысловасці. Ход выканання плана 1933 г. характарызуецца зніжэннем выпуска прадукцыі супроць 1932 г. За дзевяць месяцаў 1933 г. выпуск прадукцыі склаў 21,6 млн. руб. супроц. 22,2 м. р. за гэты-ж час 1932 г. (без перапоўных у Белмета заводаў). Ніякіх горш справа з выпускам прадукцыі шпіцрэнкава. На гэтым участку заглядаецца паступовае зніжэнне выпуска прадукцыі, пачынаючы з 1 квартала 1933 г. Так у 1 квартале выпуск прадукцыі склаў 1,1 м. р., у II квартале 0,8 м. р., у III квартале — 0,9 м. р., а за 20 дзён кастрычніка план выканан усяго на 65,7 проц. Усяго за 9 месяцаў план па шырпатрэбу выканан на 72,4 проц. і за верасень на 57,1 проц., у той час, калі нават мясцовая прамысловасць РВК і гарсоветаў па жыццёваму плану выканала па 77,2 проц. за 9 месяцаў і на 73 проц. за верасень.

Наркамцяжпрам металаапрацоўчай прамысловасцю па сутнасці не кіруе. У вытворчым сектары ўся металаапрацоўчая група прадстаўлена эканамістам дрэваапрацоўчыкам т. КОГАНАМ, які зусім не здолеў кіраваць гэтым участкам. Асабліва нездавальняюча пастаўлена работа па тэхнічна-планавасму кіраўніцтву шырпасажнікам. Зусім не вядзецца работы на вывучэнню запатрабаванняў шырокіх мас, на палепшэнню якасці прадукцыі, выпучэнню асортымента, спецыяльнасці заводаў. Зусім няма сувязі з таварапрадаючай сеткай. Заводы ў гэтых паўгадах поўнасцю прадастаўлены самі сабе.

У выніку гэтай бескантрольнасці, безадказнасці кіраваць па-сапраўднаму, рад важнейшых заданняў урада і партыі былі сарваны (выпуск запасных частак для трактараў, торфакамбайнаў і рад іншых).

У галіне будаўнічых матэрыялаў, не гледзячы на рад пастаноў урада і партыі, становішча з выкананнем плана на зусім нездавальняючае. Выкананне плана ідзе ніжэй 1932 г., не гледзячы на правядзенне ў 1931 і 1932 г. г. значнага будаўніцтва і пуск новых заводаў, якія ўвайшлі ў эксплаатацыю ў 1932 і 1933 г. За 9 месяцаў 1933 г. выпуск прадукцыі па будматэрыялах склаў 1.652,7 т. р. супроц 1773,6 у 1932 г.

Не гледзячы на пастанову СНК СССР аб арганізацыі ўсёй работы па будматэрыялах, аб выяўленні патрэбы ў іх на БССР, аб планаванні вытворчасці і прымяненні рэканструкцыі [illegible] справу, Наркамцяжпрам Б/ компарэ ў гэтым напрамку не пра[illegible] заключэння зусім нездавальняюча. 1918 годзе. завод, штучных сушкі [illegible] лікімі порабкамі і яшчэ лозунгамі ба не асвоены. Рад заводаў, барацьбы сусіх укладзены [illegible] ратаванне Торгце даюць нікага эфе[illegible]

нашы завод, фібралітавы завод, завод буйна-блочных камянёў, чарапічны завод і т. д.), але Наркамцяжпрам лічыць гэта звычайным.

Па раду заводаў няма матэрыялаў тэхнічна-эканамічнага абгрунтавання і ў асабліваці мат

ПРАМОВА ГІТЛЕРА

БЕРЛІН, 11 лістапада.

Гітлер сказаў па радыё прамову ў сувязі з надыходзячымі «выбарамі». Пераважная частка прамовы была прысвечана выхвалянню «дасягненняў» урада.

Па эканомна-палітычных пытаннях Гітлер заявіў:

«Мы хочам паціснуць руку нашым раней ...ным працаўнікам. Мы хочам роўнапраўя, а роўнапраўе азначае магчымасць абараняць свае інтарэсы перад другімі... Мы ахвотна гатовы прыняць удзел у любой канферэнцыі, у любой міжнароднай згодзе, але толькі ў мясці роўнапраўных. Або мы карыстаемся роўнапраўем, або нас не ўбачаць ні на адной канферэнцыі». (БЕЛТА).

РЭЗКІЯ ВОДГУКІ ФРАНЦУЗСКАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ, 11 лістапада.

Друк ацэньвае прамову Гітлера, як адкрыты заклік да рэвізіі дагавораў пагражаючы сур'ёзнымі вынікамі для ўсёй Эўропы ў цэлым.

Плебісцыт, у рэзультаце якога, па думцы французскага друку, не прыходзіцца сумняваць з прычыны «тэхнікі галасавання», з'явіцца сігналам да адкрытага адмаўлення Германіі ад абавязацельстваў, прынятых ёю па Версальскаму дагавору.

«Тэм» заўважае, што нельга згадзіцца на скліканне канферэнцыі чатырох або пяці дзяржаў для абмеркавання пытанняў аб раззбраенні. Газета настойвае, што перагаворы павінны весціся толькі ў Жэневе.

«Усякая думка аб скліканні канферэнцыі 4-х або 5-ці дзяржаў з мэтай пошукаў выхада павінна быць адкінута, як небяспечная для эўропейскага пакоя і для самога існавання Лігі нацый».

«Было-б недарэчнасцю,—піша «Матэн»,—калі-б Гітлер, які прапагандуе з такой гарачнасцю ідэю вызвалення ад Версаля, г. зн. ідэю перагляду ...ня Германіі, не меў намера перайсці пасля плебісцыта да ажыццяўлення гэтай ідэі».

Пертынакс у «Эко дэ-Пары» заўважае, што Гітлер намерэн патрабаваць раўнасці не толькі ваенных, але і тэрытарыяльных артыкулаў Версальскага дагавора.

«Ліберэ» піша:

«На другі дзень пасля плебісцыта Германія адкіне ўсякія абмежаванні і разарве ўсякія дагаворы»:

Гэтымі апошнімі прасякнуты ўсе паведамленні берлінскіх карэспандэнтаў французскіх газет. (БЕЛТА).

ПАДРЫХТОЎКА ВЫБАРЧАГА ФАРСА

БЕРЛІН, 11 лістапада.

Апошнія дні ўрадовай «перадвыбарчай кампаніі» характарызуюцца непрыкрытымі папрокамі па адрасу тых, хто думае ўстрымацца ад удзела ў гэтых выбарах.

З гэтага можна заключыць, што, як відаць у масах моцны тэндэнцыі ўхілціцца ад удзела ў выбарах.

«Вольф» паширае спецыяльнае паведамленне, у якім гаворыцца, што многія думаюць, быццам ім удасца ўнікнуць пастроля, калі яны возьмуць у сваім выбарчым участку дазвол галасаваць у якім-небудзь іншым участку.

Паведамленне падкрэслівае, што ў такіх выпадках вельмі лёгка будзе праверыць, хто прымаў удзел і хто не прымаў удзела ў галасаванні.

Пяць газет друкуюць на відным месцы гэта паведамленне, якое мае мэтай прымусіць усіх прыняць удзел у выбарах. На пляцах Берліна пастаўлены транспаранты з надпісамі, што кожны, хто не прыме ўдзела ў выбарах—«дзяржаўны здрадзік».

(БЕЛТА).

АКТЫЎНАСЦЬ ГЕРАІЧНАЙ КПГ

БЭРЛІН, 11 лістапада.

У сувязі з заўтрашнімі «выбарамі» ў рэйхстаг, ва ўсіх частках Германіі праведзены масавыя арышты сярод рэвалюцыйных рабочых.

Як паведамляе друк, падпольныя комуністычныя арганізацыі развіваюць энергічную дзейнасць.

У Золінгене ў рабочых кварталах усе дамы, платы, ліхтарныя слупы былі ноччу аклеены тысячамі комуністычных лістовак з надпісамі: «Галасуйце супроць урада, выбірайце компартыю». «Вінаватых» не былі выяўлены. Аднак, паліцыя арыштавала 40 «падазроных». Абвешчана, што «калі дзейнасць комуністаў не спыніцца, будуць праведзены далейшыя арышты».

З Бёрзена паведамляюць, што там у рабочых раёнах былі расклеены комуністычныя лозунгі і плакаты. Паліцыя зноў арыштавала і адправіла ў канцэнтрацыйныя лагеры ўжо выпушчаных раней адтуль рэвалюцыйных рабочых.

У Ахене ў сувязі з распаўсюджаннем вялізарнай колькасці комуністычных лістовак і расклейваннем лозунгаў і плакатаў арыштаваны 23 чалавекі, абвінавачаныя ў прыналежнасці да компартыі. (БЕЛТА).

ЗВАРОТ СОВЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ З ТУРЭЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ

УРАЧЫСТАЯ СУСТРЭЧА Ў АДЭСЕ

АДЭСА, 11 лістапада.

Звыш 200 тысяч працоўных Адэсы дэманстравалі сёння ў гонар тав. Варашылава і совецкай дэлегацыі, якая вярнулася з Турцыі, у гонар суправаджаючых іх турэцкіх гасцей і турэцка-совецкай дружбы.

Па ўсяму гораду развешаны сцягі і транспаранты. На прыстані плакаты з надпісамі на турэцкай і рускай мовах: «Калі ласка, просім», «Няхай жыве совецка-турэцкая дружба—аплот міру» і г. д.

Заўтра да прыбыцця ваеннага турэцкага карабля «Ізмір» на прыстані і па вуліцах горада выстраіліся шпалерамі часці Чырвонай арміі і рабочыя заводаў. Эскадрыльі самалётаў роюць над морам.

Роўна ў 10 гадзін раніцы паказаўся «Ізмір». Ваенныя караблі салютуюць 19-цю гарматнымі стрэламі, заводы салютуюць гудкамі. Карабель прычальвае пад гучныя крыкі «ўра».

Камандуючы войскамі УВА тав. Якір, начальнік палітвіраўніцтва УВА тав. Хахлін'як, сакратар Адэскага абкома Вегер, старшыня выканкома Голуб і інш. вітаюць тав. Варашылава і гасцей, суправаджаючых совецкую дэлегацыю, прадстаўнікоў турэцкага ваеннага міністэрства і міністэрства замежных спраў.

Тав. Варашылаў вітаецца з гаварой вартай, потым прапускае трэманальным маршам войскі. Перад тав. Варашылавым праходзяць дэманстранты—рабочыя завода імя Марці, чырвонасцяжнай джутавай фабрыкі і інш. Работніцы кідаюць кветкі на трыбуну, дзе стаяць совецкая дэлегацыя і турэцкія госці. Раздаюцца бесперапынныя крыкі «ўра».

Сядаючы ў аўтамабіль, тав. Варашылаў, пад гучныя крыкі «ўра», усклікае:

«Няхай жыве турэцкая армія і яе слаўны прадстаўнік Ізэтым-паша!»

Ізэтым-паша ўсклікае: «Няхай жыве Варашылаў—правадыр геройскай Чырвонай арміі»! (БЕЛТА).

МІЖНАРОДНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПРАДСТАЎНІКОЎ ПРЭСЫ

УХВАЛЕННЕ СОВЕЦКАЙ ПРАПАНОВЫ

ПАРЫЖ, 10 лістапада.

На міжнародній канферэнцыі прадстаўнікоў урэдаў па справах друку ў Мадрыдзе вершая камісія адпаталоспа пры апладысментах прыняла рэзалюцыю, прапанаваную совецкім дэлегатам тав. Розенбергам.

Рэзалюцыя заклікае друк не публікаваць хлуслівыя паведамленні і фальшыўкі, якія дапамагаюць падпрых тоўцы, ажыццяўленню ці апраўданню нападу.

Рэзалюцыя заклікае таксама адмовіцца ад апублікавання паведамленняў, якія тлумачаць паняцце нападу, неадпаведна паняццям нападу, сфармуляваным у лондонскай канвенцыі. Нарэшце, рэзалюцыя патрабуе, каб для прадстаўнікоў друку розных краін быў устаноўлен аднолькавы рэжым у адпаведнасці з законадаўствам і каб гэты рэжым не ставіў у горшае становішча журналістаў той ці іншай краіны.

За прапанову тав. Розенберга выказаліся дэлегаты ПАЗШ, Францыі, Польшчы, Турцыі і Румыніі. Розенберг са здавальненнем адзначыў, што рэзалюцыя выпрацавана пры дзейсным удзеле польскага дэлегата і дэлегатаў іншых краін—удзельніц лондонскіх канвенцый.

Вялікую сенсацыю выклікала выступленне тав. Розенберга ў той-жа камісіі па пытанню аб неабходнасці забяспечыць друку незалежнасць ад ваеннай прамысловасці.

Тав. Розенберг унёс папраўку да прапановы дэлегата ПАЗШ па гэтаму пытанню. Папраўка прапануе прыцягваць рабочыя і прафсаюзныя арганізацыі да барацьбы за забеспячэнне незалежнасці друку ад капіталістычных груп. Дэлегат ПАЗШ выказаўся за гэту папраўку. Аднак, камісія ўстрымалася ад прыняцця яе.

На канферэнцыі прадстаўлены ...радныя бюро друку 29-ці краін, буйнейшыя тэлеграфныя агенцтвы, бюро інфармацыі Лігі нацый і г. д.

(БЕЛТА).

ПРАБЫВАННЕ М. М. ЛІТВІНАВА У ПАЗШ

М. М. ЛІТВІНАЎ АБ ГУТАРЦЫ З РУЗВЕЛЬТАМ

ВАШЫНГТОН, 10 лістапада.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку Рузвельт абвясціў, што ўвечары будзе мець прызнаную неафіцыяльную гутарку з тав. Літвінавым у Белым доме.

Літвінаў прыбыў у Белы дом а 21 гадзіне і заставаўся там, гутарачы з Рузвельтам на працягу 3 гадзін. Пакідаючы Белы дом у поўнач, тав. Літвінаў заявіў:

— Была прыемная гутарка.

Спецыяльны памочнік міністэрства замежных спраў Буллітт, які суправаджаў тав. Літвінава в Белага дома, заявіў, што перагаворы развіваюцца з поспехам. Гэта была першая гутарка Рузвельта з Літвінавым у адсутнасці міністра замежных спраў Хелла і іншых членаў урада. (БЕЛТА).

БАНКЕТ У ГОНАР М. М. ЛІТВІНАВА

ВАШЫНГТОН, 10. лістапада.

Турэцкі пасол **МУХТАР-БЕЙ**, старшыня дыпкорпуса, даў банкет у гонар **М. М. ЛІТВІНАВА.** Прысутнічалі: тав. Літвінаў, загадчык совецкага інфарбюро тав. Овінерскі, загадчык «Амторга» тав. Бааданаў, сакратар калегіі НКЗС тав. Дзівількоўскі, загадчык аддзела друку НКЗС тав. Уманскі, французскі і італьянскі паслы, грэчаскі і персідскі пасланнікі, паверэны ў справах Польшчы і кіраўнік амерыканскага бюро па крэдытаванню сельскай гаспадаркі Моргентау. (БЕЛТА).

ДАЛЕЙШЫЯ СУСТРЭЧЫ

ВАШЫНГТОН, 11 лістапада.

Наступныя гутаркі Рузвельта з Літвінавым адбудуцца ў хуткім часе. Гэтыя гутаркі, як відаць, прадоўжацца 4 або 5 дзён

* * *

Сёння, у 16 гадзін (паводле амерыканскага часу) адбылася гутарка паміж тав. Літвінавым і намеснікам дзяржаўнага сакратара п. Філіпсам. (БЕЛТА).

У ГОСЦЯХ У ЛЕНІНГРАДСКІХ ПРОЛЕТАРЫЯЎ

(Ад нашага спецкарэспандэнта)

Учора вярнулася з Ленінграда беларуская дэлегацыя ўдарнікаў рабочых і калгаснікаў, прымаўшая ўдзел разам з ленінградскімі рабочымі ў святкаванні 16-годдзя Кастрычніка.

У дзень прыезда — 6 лістапада — у ленінградскім абласовеце адбыўся прыём прыбыўшых дэлегацый саюзных рэспублік. У сваёй кароткай прамове нам. старшыні Ленаблсовета тав. **КАРАЛЁЎ** адзначыў найвялікшыя дасягненні Совецкага саюза да 16-годдзя Кастрычніка, спыніўся на далейшых задачах, асабліва на неабходнасці яшчэ большага ўзмацнення абароназдольнасці Совецкага саюза.

У гэты-ж дзень увечары частка беларускай дэлегацыі прымала ўдзел у рабоце ўрачыстага пленума Ленінградскага совета, іншыя таварышы наведалі тэатры і кіно.

7 лістапада беларуская дэлегацыя ў поўным складзе прымала ўдзел у дэманстрацыі паўтара мільёна працоўных Ленінграда на пляцы Урыцкага. Беларускай дэлегацыі была адведзена спецыяльная трыбуна.

Парад войск прадстаўляў сабою баявы агляд ліганкі вырасшай тэхнічнай магутнасці Чырвонай арміі. Усе роды войск — пяхота, артылерыя, лётнікі, маракі, бронетанкі, танкі, танкеткі, пражэктары, гукаўлоўнікі і інш. — дэманстравалі не толькі сваю магутную сілу, але і гатоўнасць у любую мінуту адбіць напад ворагаў Совецкага саюза.

Следам за войскамі на пляцы Урыцкага разгарнуліся шматлікімі радамі фізкультурнікі, трымаўшыя ў вышэйшую сотні рознакалярных, бліскучых шароў. Перад дэманстрацыяй пролетарыяў Ленінграда быў дан гарматны стрэл з суднаў Балтыйскага флота на чале з крэйсерам «Аврора».

Заварушылася мільённая хваля пролетарыяў горада Леніна. Спорнымі радамі рабочыя і работніцы завода—ВТУЗ'а імя Сталіна, «Путиловца», «Электросилы», «Красного знамени», імя Маркса Гельца і соцень другіх з высока паднятымі сцягамі і лозунгамі праходзяць мімо галоўнай трыбуны, на якой стаяць т. т. Кіраў, Жданаў і інш. кіраўнікі ленінградскіх пролетарыяў.

Яшчэ мацней загрымелі гарматы, загрукацелі кулямёты. Безліч ракет сваім рознакалёрным агнём запаліліся ў паветры.

Раптам уьсь пляц і дах Зімняга палаца быў ахоплен яркім багровым полымем — так было ў 1917 годзе ў часе захвата Зімняга.

На беларускую дэлегацыю інсцэніроўка ўзяцця Зімняга палаца зрабіла велізарнае ўражанне.

— На мяне, — таварыш дэлегат, рабочы-ўдарнік завода «Комунар» тав. Бірук, — дэманстрацыя ленінградскіх пролетарыяў зрабіла хвалюючае ўражанне. Тут на дэманстрацыі я адчуў яшчэ больш сілу нашага класа, сілу нашай партыі. Усе свае сілы і веды я аддаю на выкананне прамфінплана.

8-га лістапада дэлегаты наведалі былую Пятраўпаўлаўскую крэпасць.

9 лістапада, у дзень ад'езда, Леносавет наладзіў банкет для дэлегацый рэспублік. Са здавальненнем была адзначана прадстаўніком Леносавета прысутнасць беларускай дэлегацыі ў знак большэвіцкага выканання Беларуссю свайго пролетарскага абавязка перад рабочымі Ленінграда — дэдэрмінованага перавыканання плана адгрузкі бульбы.

За ўвесь час знаходжання ў Ленінградзе дэлегаты Беларусі наведалі тэатры, кіно і інш. культурныя ўстановы.

Арк. Зарубежны.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Культпроп ГК КП(б)Б 14-XI, у 6 г. веч., у Доме комасветы склікае нараду старост партшкол і гурткоў, прапагандыстаў і культпропаў п-к і ячэек КП(б)Б па пытанню аб ходзе партвучобы і пастановы колькаснага і якаснага ўліку работы партшкол.

Культпроп ГК КП(б)Б.

* * *

УСІМ ТРЫКУТНІКАМ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І УСТАНОЎ Г. МЕНСКА.

Згодна пастановы ГК КП(б)Б і нарады трыкутнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў ад 10-XI г. г. аб правядзенні выпорчага пахода імя тав. Пікало. сакратары партячэек прадпрыемстваў і ўстаноў павінны штодзённа прадстаўляць у гарком весткі, падагуленыя трыкутнікамі аб ходзе пахода, зводкі аб выкананні прамфінплана па прадпрыемствах за кожны дзень у паасобку.

Зводкі можна перадаваць па тэлефону дзяжурнаму гаркома ад 5 да 7 гадзін веч.

Тэл. 23—950.

Заг. аргаддзела менгаркома КП(б)Б ГЕРШОН.

Аб узмацненні крымінальнай і матэрыяльнай адказнасці за безгаспадарчае кіраванне і ўтрыманне жыллёвых памяшканняў

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Службовыя асобы дзяржаўных, кааперацыйных і грамадскіх устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, якім даручана кіраванне непажылымі памяшканнямі (кіраўнікі дамамі, загадчыкі дамамі, каменданты і інш.), у выпадках безгаспадарчага кіравання гэтымі памяшканнямі нясуць матэрыяльную адказнасць за зробленыя ў выніку безгаспадарчасці страты і, апрача таго, прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці па арт. 196 крымінальнага кодэкса.

У такім-жа парадку нясуць матэрыяльную і крымінальную адказнасць за безгаспадарчае кіраванне дамамі выбарныя члены праўленняў жактаў і ЖБКТ.

2. З'ёмшчыкі жыллёвай плошчы за безгаспадарчыя і драпежніцкія адносіны да занятых імі памяшканняў нясуць матэрыяльную адказнасць у размеры нанесеных страт і прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці паводле арт. 253 крымінальнага кодэкса.

Да паказаных з'ёмшчыкаў прад'яўляюцца таксама іскі аб выселенні з занятых імі памяшканняў.

3. Прапанаваць рэйонным выканаўчым камітэтам і гарадскім советам выдаць абавязковыя пастановы, якімі прадугледзець накладанне штрафаў на паказаных у арт. 2 асоб за безгаспадарчае і антысанітарнае ўтрыманне жыллёвай і дапаможнай плошчы, калі такія дзеянні не маюць характару злачынства.

Штрафы гэтыя накладваюцца па актах, складзеных домакіраўніцтвам або органам комунальнай гаспадаркі, у размеры ў першы раз да 10 руб., а ў другі раз да 25 руб. у парадку, прадугледжаным пастановай ЦВК і СНК БССР ад 15 мая 1931 г. «Пра абавязковыя пастановы раённых выканаўчых камітэтаў і советаў і пра парадак накладання адміністрацыйных спагнанняў» (З. З. БССР 1931 г. № 19, арт. 155).

Штрафныя сумы, якія спагнаюцца паводле гэтай пастановы, паступаюць у размеры 50 проц. у гарадскі бюджэт на фінансаванне жыллёвага будаўніцтва і 50 проц. запічваецца ў прыбытковую частку каштарысаў адпаведных домакіраўніцтваў і кааператываў, якія адказваюцца выключна на рэмонт жыллёвай плошчы.

4. Абавязаць усе дзяржаўныя, кааперацыйныя і грамадскія ўстановы і прадпрыемствы:

а) неадкладна аформіць дагаворамі і актамі здачу з'ёмшчыкам занятай імі жыллёвай плошчы і ў далейшым здаваць жыллёвую плошчу абавязкова па дагаворах і актах;

б) пры выездзе жыхароў складаць акты аб стане памяшканняў, якія ім аслабяняюцца;

в) правяраць перыядычна (не менш 1 раза ў год) становішча жыллёвых і абслугоўваючых памяшканняў пры абследаванні на месцы і аб усіх пашкоджаннях складаць акты для прыцягнення вінаватых да адказнасці.

5. Абавязаць домакіраўніцтвы прад'яўляць да з'ёмшчыкаў жыллёвай плошчы іскі аб спагнанні з іх кошта папсаванай па іх віне маемасці і ўзбуджаць крымінальныя справы супроць з'ёмшчыкаў, якія безгаспадарча ўтрымліваюць і па-драпежніцку знішчаюць жыллёвую плошчу з адначасовым прад'яўленнем іскаў аб высленні іх з занятых памяшканняў і аплаты страт.

6. Абавязаць пракуратуру ўзмацніць нагляд за захаванасцю жыллёвага фонда, прыцягваючы да жорсткай адказнасці службовых асоб домакіраўніцтваў і жыхароў, вінаватых у безгаспадарным кіраванні і драпежніцкім знішчэнні жыллёвай плошчы.

7. Абавязаць Народны камісарыят комунальнай гаспадаркі і Белжылсаюз па ўзгадненні з Народным камісарыятам юстыцыі выдаць інструкцыю аб парадку ўжывання гэтай пастановы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР ЛЯЎКОЎ.
25 кастрычніка 1933 г.

Папраўка

У дакладзе тав. Молатава, змешчаным у нашай газеце (нумар 249 ад 11 лістапада) у 4-й калонцы з 34-га радка зверху трэба чытаць: «Партыя і ўрад з усёй рашучасцю патрабавалі спынення разбуховых кіраўнічых апаратаў...» 11-ты радок гэтай-жа калонкі трэба чытаць: «У гэтым годзе ўжо звыш чатырох пятых усіх пасеваў належалі калгасам і саўгасам».

14 лістапада г. г. у 7 гадзін вечара, у памяшканні гарсовета (вуліца Карла Маркса, нумар 32)

адбудзецца

ГАРАДСКІ ЗЛЕТ ГРУП САДЗЕЙНАСЦІ РСІ СУМЕСНА З ПРАФАКТЫВАМ г. МЕНСКА.

У ПАРАДКУ ДНЯ

Даклад аб чарговых задачах РСІ і прафарганізацыі ў сувязі з пастаўленымі задачамі газэтай „Правда" (дакладчык т. Хадасевіч).

На зьезд павінны з'явіцца кіраўнікі і актыў „ЛК", групы садзейнасці і пасты РСІ на прадпрыемствах, групы садзейнасці гарпракуратуры, старшыні заводскіх камітэтаў, прафактывы, рэдактары шматтыражак і насценгазет.

Запрашаюцца работнікі палітаддзела чыгункі, пракуратуры і рабкоры г. Менска.

ГАРКІМ-РСІ
ГОРПРАФСОВЕТ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

БАЛАНС ГАСПАДАРЧЫХ СРОДКАЎ

Беларускага Дзяржаўнага трэста шкляной прамысловасці „БЕЛШКЛАТРЭСТ" на 1 студзеня 1933 г. і параўнанне яго з данымі бухгалтарскага баланса за 1931 г.

АКТЫЎ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума На 1-1-32 г	Сума На 1-1-33 г
(Склад і размеркаванне сродкаў)		
I. АСНОЎНЫЯ СРОДКІ:		
1. Будынкі і будоўлі вытворч.	871627—53	1208035—18
2. Абсталяван. сілав. установкі, машыны і інструманты	1740594—03	1782073—62
3. Транспарт	69741—15	116448—67
4. Гаспадарчы інвентар	230508—78	214484—15
5. Запасное абсталяванне	20391—41	9331—22
6. Жыллёвыя, гандлёвыя і інш. невытворч. прызначэння будынкі	480602—21	483498—86
7. Іншыя	56200—00	74253—00
Усяго па I раздзелу	3469565—11	3888124—71
II. ВЫТВОРЧ. ЗАПАСЫ НА СКЛАДЗЕ І Ў ПУЦІ.		
1. Сыравіна, асноўныя і дапаможныя матэрыялы, тара	837960—86	948604—80
2. Паліва	97503—17	274778—23
Усяго па II раздзелу	935464—03	1223383—03
III. НЯСКОНЧАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ.		
1. Астаткі незавершанай вытворч. і паўфабрыкатаў (свайх)	38944—78	39469—99
2. Няскончаныя капітальн. работы.	152785—22	141071—46
Усяго па III раздзелу.	186730—00	180541—45
IV. ТАВАРНЫЯ ЗАПАСЫ.		
1. Тавары і фабрыкаты (на складзе і ў пуці)	936433—57	1552167—97
2. Тавары адгружаныя (і неаплочаныя).	400392—12	443364—52
3. Матэрыялы для рэалізацыі і неліквіды.	—	8872—82
Усяго па IV раздзелу.	1336825—69	2004405—31
V. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Разрахунковыя і асобн. рахункі ў крэдытных установах	464914—86	500798—91
2. Каса і грашовыя пераводы	16530—26	11852—25
Усяго па V раздзелу	481445—12	512651—16
VI. РАЗЛІКІ.		
1. Справаздачныя сумы	12016—10	43592—17
2. Дэбіторы	442291—14	518570—79
3. Няскончаныя загатоўкі	13725—91	2014—59
4. Выдаткі будучых гадоў	157767—42	99087—80
Усяго па VI раздзелу	625800—57	663265—35

ПРАЦЯГ АКТЫВА	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
VII. ВЫДЗЕЛЕНЫЯ СРОДКІ.		
1. Каштоўныя паперы	3465—00	3465—00
2. Паі, акцыі і ўдзел у інш. аргал.	359651—17	474597—45
3. Уклады ў крэдыт. установы		
а) у БДК	63665—79	63665—79
б) у ЦКВ	422279—05	422279—05
4. НКФ па адліч. з прыбыткаў	547445—00	—
Усяго па VII раздзелу	139506—01	964007—29
VIII. СТРАТЫ		
1. За справаздач. перыяд	855276—30	—
УСЯГО па VIII разделу	855276—30	—
БАЛАНС	9287612—83	9436378—30

ПАСІУ

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума На 1-1-32 г.	Сума На 1-1-33 г.
(Стварэнне і прызначэн. сродкаў)		
I. УНУТРАНЫЯ РЭСУРСЫ.		
1. Статутныя фонды	5320369—64	5311525—66
2. Мэтавыя фонды:		
а) фонд амартызацыі	137993—33	125225—82
б) ФУБР	367731—65	334731—65
в) іншыя	29588—54	19991—92
3. Ізнос асноўн. фондаў па стану на 1-X-25 г	188565—25	121682—30
4. Іншыя рэгулюючыя артыкулы	361518—00	260975—41
Усяго па I раздзелу	6405766—41	6274332—76
II. ПАЗЫКОВЫЯ СРОДКІ.		
1. Доўгатэрміновыя крэдыты	682634—36	680234—36
2. Кароткатэрміновыя пазыкі крэдытных устаноў	647520—84	417857—09
3. Разлікі з бюджэтам (саюзн., рэспубл., мясцов.)	174144—99	74167—01
4. Крэдыторы	1377546—23	1807849—65
Усяго па II раздзелу	2881846—42	2980047—42
III. НАКАПЛЕННІ (ПРЫБЫТАК).		
б) за справаздачн. перыяд	—	181998—12
Усяго па III раздзелу	—	181998—12
БАЛАНС	9287612—83	9436378—30

СТРАТЫ — *Рэзультаты гаспадарчай дзейнасці за 1932 г.* — *ПРЫБЫТКІ*

СТРАТЫ	
1. Страты ад рэалізацыі тавараў і па аказаних паслугах (сальдо).	—
2. Страты ад ліквідацыі выбыўшай маемасці	61760—45
3. Страты ад стыхійных бядот	—
4. Страты ад спісання безнадзейных даўгоў і за пропускам тэрмінаў даўнасці	28604—12
5. Процанты аплочаныя	—
6. Іншыя страты	389124—44
7. Страты мінулых год	—
УСЯГО: руб.	479489—01
Чысты прыбытак	181998—12
УСЯГО:	661487—13

ПРЫБЫТКІ	
1. Прыбытак ад рэалізацыі тавараў і аказання паслуг (сальдо)	350002—40
2. Прыбытак ад паступлення па безнадзейных даўгах і ад спісання крэдыторскай запазычанасці за пропускам тэрмінаў іскавай даўнасці	17692—34
3. Прыбытак ад ліквідацыі выбыўш. маемасці	155—31
4. Процанты і пені, атрыманыя	—
5. Іншыя прыбыткі і даходы	293637—08
6. Прыбыткі мінулых год	—
РАЗАМ руб.	661487—13
УСЯГО: руб.	661487—13

Асноўныя паказальнікі выканання плана

	На плану 1932 г.	Фактычна За 1931 г.	Фактычна За 1932 г.
1. Выпрацоўка (загатоўка) важнейшых відаў прадукцыі ў натуры	21500 тон	16515 тон	16158 тон
2. Валавая прадукцыя па сабекошту (у тыс. руб.)	9050	6788	8599
3. Зніжэнне сабекошта (у проц. да папярэдняга года)	—1,67	—	+25,1
4. Сярэдняя гадавы лік рабочых і навучаючыхся	3636	3518	2944
5. Адпрацаваная імі колькасць чалавека-дзён	927796	821200	739379
6. Агульны фонд заработнай платы ўсяго персанала	3988700	3248619	3650027
7. У тым ліку фонд зарплаты рабочых	3418400	2820684	3066910
8. Сярэдняя гадавы лік служачых	108	109	128
9. Агульна-адміністрацыйныя выдаткі	116	98,2	142,5
10. Здана ў эксплаат. аб'ектаў [illegible] прадпрыемстваў новых [illegible] (у тыс. руб.) у тым ліку прад- [illegible]	—	371,5	864

Кіраўнік [illegible] Морказаны [illegible] сходзе калегіі [illegible] Тыя з найпільнкаў, якім Баланс [illegible] ОЭС НКЛП Кі дасталіся ў закончаным кір[illegible] [illegible] падкладна пасліліся, а астатні [illegible] стаў чакаць скончэння другога [illegible] [illegible] ізючы замацаваны за са- [illegible] [illegible] [illegible]